ISBN 978-985-6941-79-8

Нацыянальны інстытут адукацыі

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

ФАКУЛЬТАТЫЎНЫЯ ЗАНЯТКІ

Т. У. Логінава, Т. І. Мароз

# ТАЯМНІЦА ПАЭЗІІ І ЗАГАДКА ПРОЗЫ

7 КЛАС

Дапаможнік для настаўнікаў

Нацыянальны інстытут адукацыі

Беларуская літаратура
Факультатыўныя заняткі

**Т. У. ЛОГІНАВА, Т. І. МАРОЗ**

# ТАЯМНІЦА ПАЭЗІІ І ЗАГАДКА ПРОЗЫ

**7 клас**

***Дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання***

*Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Мінск
«Літаратура і Мастацтва»
2010

УДК 373.5.016:821.161.3.09
ББК 74.268.3 (4Беи)
Л69

*Серыя заснавана ў 2010 г.*

**Логінава, Т. У.**
Л69 Таямніца паэзіі і загадка прозы : 7-ы кл. : дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / Т. У. Логінава, Т. І. Мароз. — Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2010. — 72 с. — (Беларуская літаратура. Факультатыўныя заняткі).

ISBN 978-985-6941-79-8.

**УДК 373.5.016:821.161.3.09**
**ББК 74.268.3(4Беи)**

**ISBN 978-985-6941-79-8**

© Нацыянальны інстытут адукацыі, 2010
© Афармленне. РВУ «Літаратура і Мастацтва», 2010

# ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ФАКУЛЬТАТЫЎНЫХ ЗАНЯТКАЎ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

У VII класе працягваецца спасціжэнне сутнасці слоўнага мастацтва, спецыфічных законаў яго функцыянавання. Увядзенне школьнікаў у свет мастацкай літаратуры адбываецца праз параўнальны разгляд двух асноўных відаў мастацкай творчасці — паэзіі і прозы. Гэта робіцца для таго, каб вучні не толькі ўбачылі знешнія, фармальныя адрозненні паэзіі і прозы, але і зразумелі самае істотнае ў гэтых відах літаратурнай творчасці. У дзяцей павінна быць сфарміравана ўяўленне аб тым, што на характар паэтычных і празаічных твораў надзвычай моцна ўплываюць іх дачыненні да жыцця, той жыццёвы змест, што яны выяўляюць. Паэзія — гэта не толькі рытмічная мова, але найперш мастацкая творчасць, якая абуджае моцныя перажыванні і пачуцці, выклікае асаблівую настроенасць душы пры ўспрыманні з’яў навакольнай рэчаіснасці. Галоўнае ў прозе — стварэнне пэўнай карціны жыцця, дакладнае, але пры гэтым вобразнае апісанне жыццёвага факта ці эпізоду.

Праграма факультатыўнага курса «Таямніца паэзіі і загадка прозы» прызначана для вучняў, якія захапляюцца мастацкім словам, адчуваюць яго адметнасць і прыгажосць, цікавяцца багаццем літаратурнай спадчыны. Прапанаваны факультатыўны курс, пры цесным узаемадзеянні з урокамі беларускай літаратуры, зможа пашырыць матэрыял падручніка займальнай інфармацыяй,

скіруе ўвагу навучэнцаў на творча-практычнае замацаванне ведаў, пошукавую дзейнасць, што не толькі дазволіць паспяхова арганізаваць вучэбны працэс, але і будзе садзейнічаць развіццю эмацыянальнай сферы вучняў.

Мастацкія творы, змешчаныя ў праграме, дазваляюць фарміраваць у школьнікаў сістэму каштоўнасных адносін да жыцця, эстэтычныя ўяўленні, нацыянальную самасвядомасць, пашыраць мастацкі і агульнакультурны кругагляд, выхоўваць цікавасць да літаратуры як прадмета.

***Мэта курса*** — пашырыць літаратурныя і культуралагічныя веды вучняў, развіваць іх эстэтычны густ і агульную культуру.

У факультатыўны курс уключаны творы, разнастайныя па змесце і мастацкіх асаблівасцях. На прыкладзе гэтых твораў школьнікі знаёмяцца з галоўнымі асаблівасцямі літаратуры як мастацтва, спасцігаюць яе мастацка-эстэтычную спецыфіку, паглыбляюць (на ўзроўні чытацкіх патрэб) веды і ўменні аналізу і ацэнкі твораў, атрымліваюць першаснае ўяўленне пра законы мастацкай творчасці.

Вывучэнне прапанаванага курса мэтазгодна праводзіць комплексна: разгляд і замацаванне тэарэтычных ведаў спалучаць з сістэмай вучэбна-творчых заданняў. Засваенне тэарэтычных паняццяў пажадана канкрэтызаваць праз іх дыферэнцыяцыю. Авалоданне літаратуразнаўчымі паняццямі, тэрмінамі дапаможа вучням свабодна арыентавацца ў праграмным матэрыяле.

Другі тып заданняў непасрэдна звязаны з развіццём навыкаў успрымання і аналізу паэтычных і празаічных твораў у іх мастацкай своеасаблівасці, выпрацоўкай агульных падыходаў да вывучэння мастацкага твора: чытанне і абмеркаванне вершаваных і празаічных твораў, супастаўленне твораў розных жанраў на адну і тую ж тэму і г. д.

Серыя творчых заданняў факультатыўнага курса, разлічаных на прымяненне літаратурных ведаў, дазволіць вучням паглыбіцца ў мастацкі тэкст, спасцігнуць аўтарскую задуму твора, яго ідэйна-эстэтычнае багацце.

У вучэбнай праграме па беларускай літаратуры ў VII класе звяртаецца ўвага на тое, што «вывучэнне літаратуры на гэтай ступені адукацыі — выхаванне ўдумлівага, дасведчанага чытача, які разбіраецца ў асноўных вартасцях мастацкіх твораў, умее ацэньваць іх змест, інакш кажучы, мае добрае адчуванне і

разуменне спецыфікі літаратуры, багаты чытацкі вопыт, уласны эстэтычны густ».

Такім чынам, матэрыял факультатыўных заняткаў скіраваны на фарміраванне літаратурнай кампетэнцыі (веданне тэарэтычных паняццяў, жанравай адметнасці твораў паэзіі і прозы, сродкаў мастацкай выразнасці і інш.) праз развіццё ключавых уменняў вучняў (самастойна набываць веды — аналізаваць, супастаўляць, шукаць адказы на пастаўленыя пытанні).

## Прагназуемыя вынікі вывучэння факультатыўнага курса

***Вучні павінны ведаць:***

- назвы і змест вывучаемых літаратурных твораў і іх аўтараў;
- сюжэт апавядальных твораў, узаемаадносіны персанажаў;
- тэарэтычныя паняцці, акрэсленыя праграмай;
- асаблівасці паэтычных і празаічных твораў, вершаванай і празаічнай мовы;

***Вучні павінны ўмець:***

- супастаўляць блізкія па тэме паэтычныя і празаічныя творы і вызначаць іх асаблівасці ў паказе жыцця;
- выдзяляць эпізоды, важныя для характарыстыкі дзейных асоб, устанаўліваць прычынна-выніковую сувязь паміж падзеямі і паводзінамі герояў;
- знаходзіць адрозненне і падабенства пры параўнальнай характарыстыцы двух герояў розных твораў;
- вызначаць настраёвасць мастацкага твора, яго эстэтычны пафас;
- адрозніваць і вызначаць двухскладовыя і трохскладовыя вершаваныя памеры;
- вызначаць у тэксце мастацкую ролю выяўленчых сродкаў мовы;
- умець параўноўваць літаратурныя творы з творамі жывапісу, музыкі, тэатра і інш.;
- выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:
  - — для выбару шляхоў свайго культурнага развіцця;
  - — выражэння ўласнага меркавання аб літаратурных творах;
  - — самастойнай мастацкай творчасці.

## ТАЯМНІЦА ПАЭЗІІ І ЗАГАДКА ПРОЗЫ
*(35 гадзін)*

### І. Чарадзейная сіла мастацтва. *(6 гадзін)*

Літаратура сярод іншых відаў мастацтва. Асаблівасці адлюстравання рэчаіснасці ў літаратуры, музыцы і жывапісе (змест, сюжэты, вобразы, героі). Талент у мастацтве. «Усе віды мастацтва вучаць найвялікшаму з мастацтваў — мастацтву жыць на зямлі» (Б. Брэхт).

**Народная казка «Музыка-чарадзей»**

Магічная, чарадзейная сіла мастацтва ў творы. Выяўленне праз вобраз галоўнага героя — музыкі народных уяўленняў аб прыгожым і агідным, узвышаным і нікчэмным, трагічным і камічным.

**Генрык Сянкевіч «Янка-музыка»**

Гаротнае жыццё Янкі. Неадольнае захапленне хлопчыка музыкай, скрыпкай. Блізкасць і падабенства героя да Сымонкі (урывак з паэмы «Сымон-музыка» Якуба Коласа «У яго быў свет цікавы…»).

**Змітрок Бядуля «Музыка»**

Казачная аснова апавядання. Незвычайная адоранасць пастушка Васількі, яго паэтычнае ўспрыманне навакольнага жыцця, дабрыня і спагадлівасць да жывых істот. Роля другарадных вобразаў (жаваранка, салоўкі, рэчкі, хмаркі) у раскрыцці вобраза пастушка-музыкі. Вобраз сонейка як увасабленне жыццядайнай сілы прыроды.

### ІІ. Акрыленасць паэзіі
### і разважлівасць прозы. *(8 гадзін)*

Разгляд асаблівасцей паэтычных і празаічных твораў з апорай на веды вучняў, атрыманыя ў папярэдніх класах. Вершаванае і празаічнае слова — магутны сродак уздзеяння на чалавека.

**Валерый Пазняк «Прыходзіць час святы»**

Роздум паэта пра чарадзейную сілу мастацтва. Пераўвасабленне пад уздзеяннем музыкі звычайнага чалавека ў натхнёнага скрыпача-творцу, перад талентам якога адступае будзённасць і нараджаецца прыгажосць.

**Кастусь Жук «Скрыпка»**

Музычная адоранасць Марціна-скрыпача, яго талент як увасабленне неадольнага імкнення народа да прыгажосці. Нашчадкі музыкі — прадаўжальнікі яго справы і майстэрства. Сродкі мастацкага выяўлення ў вершы.

**Уладзімір Дамашэвіч «Абуджэнне»**

Рэальна-жыццёвая аснова апавядання. Вобраз скрыпачкі, яе надзвычайны талент, захопленасць мастацтвам. Чарадзейная сіла музыкі, яе ўздзеянне на гасцей пані Лісоўскай. Выключная ўражлівасць героя-апавядальніка, яго «абуджэнне», тонкае адчуванне музыкі. Майстэрства пісьменніка ў абмалёўцы герояў і падзей.

**Максім Лужанін «Дождж», Янка Сіпакоў «Чым пахне дождж» (урывак з нарыса «Даверлівая зямля»)**

Маляўнічая карціна вясновага дажджу, створаная пры дапамозе інтанацыі, выразнага рытмічнага малюнка і гукапісу. Роля выяўленчых сродкаў мовы ў стварэнні вобразаў прыроды (маладой збажыны, ракі, дубоў і інш.) у паэтычным творы. Выразныя карціны дажджу ў розныя поры года, якія ствараюцца пры дапамозе падрабязнага, дэталёвага апісання прыроды ў празаічным тэксце (параўнальны аналіз).

**Паўлюк Трус «Над возерам», Іван Пташнікаў «Возера Нарэчча» (урывак з апавядання «На шчасце»)**

Адухоўленасць з’яў прыроды, захапленне аўтараў гармоніяй і прыгажосцю возера. Адрозненні ў стварэнні гэтых вобразаў у паэтычным і празаічным творах. Эмацыянальная выразнасць, маляўнічасць, вобразнасць, напеўнасць верша і апавядальнасць, канкрэтнасць, апісальнасць, роўнасць інтанацыі ў празаічным творы.

**Пятрусь Броўка «Ах, восень, восень…», Іван Шамякін «У лесе і ў полі восенню» (урывак з апавядання «Непрыгожая»)**

Майстэрства пісьменнікаў у стварэнні карцін восеньскай прыроды, яе хараства і непаўторнасці. Зрокавыя і слыхавыя асацыяцыі ў творах, створаныя пры дапамозе адметных сродкаў і прыёмаў мастацкага выяўлення: рытмічнасць, мастацкія тропы (параўнанні, метафары, увасабленні) — у паэзіі, свабодна арганізаваная мова, якая гучыць звыкла, натуральна, наяўнасць выразных мастацкіх дэталяў, падрабязнасцей у апісанні восені — у прозе.

**Пятро Глебка «Хмаркі», Міхась Лынькоў «Позняя восень» (урывак з апавядання «Недапетыя песні»)**

Паэтычная карціна летняга спякотнага дня перад навальніцай (засмяглы сухі пясок, лютая гарачыня, пачарнелы лясок, перыстыя хмаркі і інш.) у паэтычным творы і апісанне позняй восені (ускудлачаныя хмаркі, пакрыўджаныя восенню бярозы, перакіслыя брусніцы, прэлая салома, жураўліная песня і інш.) — у празаічным тэксце. Адухаўленне прыроды ў паэзіі і прозе, створанае пры дапамозе розных сродкаў мастацкага выяўлення. Параўнальны аналіз.

## III. Нам родная песня ў сэрца запала. *(2 гадзіны)*

**«Прыйдзі, прыйдзі, вясна…», «Ох, і сеяла Ульяніца лянок...», «Ах ты, сонца-сонейка…», «Рабіна, рабiначка…»)**

Народныя песні як найвыдатнейшыя ўзоры паэзіі. Выяўленне ў песнях дум, перажыванняў, настрояў, пачуццяў земляроба-працаўніка, яго мар аб шчасці. Паэтызацыя з’яў прыроды, зямелькі-карміцелькі. Паэтычная ідэалізацыя — асноўны мастацкі прыём народных песень. Міфалагічныя матывы ў творах. Высокая мастацкасць, паэтычная вобразнасць, рытмічнасць, мілагучнасць іх моўнай асновы. Гармонія слова і мелодыі.

## IV. Загадкавая краіна Паэзія. *(7 гадзін)*

Паэзія як асаблівы від мастацткай літаратуры. Разнастайнасць тэматыкі паэтычных твораў. Роля слова ў паэтычным кантэксце (асаблівая выразнасць, ёмістасць, сціслаcць, шматзначнасць). Роля паэзіі ў жыцці чалавека.

**Анатоль Вярцінскі «Дзівак чалавек»**

Аптымізм і жыццялюбства, здольнасць здзіўляцца, марыць, радавацца як перадумовы паэтычнага бачання і ўспрымання свету чалавекам. Ідэя твора, роля паўтораў у яе сцвярджэнні.

**Максім Танк «Паэзія»**

Вобразная характарыстыка паэзіі ў вершы. Змест і сэнс параўнанняў і супастаўленняў паэзіі з рознымі з’явамі жыцця. Адметнасць гучання верша.

**Алег Лойка «Радзіме»**

Усведамленне героем сваёй адказнасці за лёс Радзімы. Роля вобразна-выяўленчых сродкаў у раскрыцці ідэі твора. Рытміка-інтанацыйны малюнак верша.

**Сцяпан Гаўрусёў «Хлеб-соль»**

Патрыятычны пафас верша, сцвярджэнне гуманнага, чалавекалюбівага нацыянальнага характару беларусаў. Роля народных прыказак, прымавак, дасціпных выслоўяў у раскрыцці тэмы твора. Урачыста-ўзнёслая інтанацыя верша.

**Рыгор Барадулін «Матылёк»**

Мастацкая выразнасць, маляўнічасць вобраза матылька. Сродкі і прыёмы мастацкай выразнасці ў вершы. Роля гукапісу ў стварэнні карцін прыроды.

## V. Таямнічае ў звычайным і паўсядзённым. *(12 гадзін)*

Проза як асаблівы тып мастацкай літаратурнай творчасці. Аповед, апісанне, дыялог як спосабы раскрыцця зместу ў апавядальных творах. Віды апісанняў: пейзаж, партрэт. Мастацкая дэталь і яе роля ў апавядальных, празаічных творах.

**Васіль Хомчанка «Звон пад зямлёй»**

Галоўны герой і яго дзіцячы свет. Адкрытасць, даверлівасць, непасрэднасць Васілька. Паданне пра Гарадзішча і сярэбраную цэркаўку, яго роля ў раскрыцці псіхалогіі хлопчыка. Вобраз бабы Настачкі, яе адносіны да хлопчыка. Прырода ў апавяданні.

**Якуб Колас «Дзеравеншчына»**

Душэўныя пакуты героя ў нязвыклых і нямілых яму абставінах гарадскога жыцця. Паэтызацыя вясковых летуценняў. Глыбокі псіхалагізм твора ў выяўленні характару Міхалкі, яго перажыванняў і пачуццяў.

**Янка Маўр «Палескія рабінзоны»**

Небяспечнае падарожжа. Кантраст паміж марай герояў і рэальнай небяспекай. Вобразы Мірона і Віктара, іх жыццястойкасць, вера ў свае сілы, здольнасць знайсці выйсце з любой жыццёвай сітуацыі. Прырода ў творы.

**Алена Васілевіч «Горкі ліпавы мёд»**

Рэалістычнае адлюстраванне жыцця ў творы. Раскрыццё ў апавяданні псіхалогіі падлетка, які перажывае першае інтымнае пачуццё. Вобраз Лідачкі. Сэнс назвы твора.

# ДАПАМОЖНІК ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ

## АД АЎТАРАЎ

***Мэта прапанаванага курса*** «Таямніца паэзіі і загадка прозы» — пашырыць літаратурныя і культуралагічныя веды вучняў па беларускай літаратуры, развіваць іх эстэтычны густ і агульную культуру.

У VII класе працягнецца далучэнне школьнікаў да высокамастацкіх твораў нацыянальнай класікі і вядомых майстроў слова. Паглыбленне ў свет мастацкай літаратуры адбудзецца праз параўнанне такіх разнавіднасцей мастацкай слоўнай творчасці, як паэзія і проза. Задача настаўніка — дапамагчы вучням ўбачыць не толькі знешнія, фармальныя адрозненні паэзіі і прозы, але і зразумець самае істотнае ў гэтых відах літаратурнай творчасці.

На наш погляд, вывучэнне прапанаванага курса мэтазгодна праводзіць комплексна — праз разгляд і замацаванне тэарэтычных ведаў і спалучэнне іх з сістэмай вучэбна-творчых заданняў.

Серыя творчых заданняў факультатыўнага курса разлічана на прымяненне літаратурных ведаў. Гэта дазволіць вучням адчуць сябе ў якасці акцёра, рэжысёра, папрацаваць над мастацкім тэкстам прозы, лірычнага верша, падрыхтаваць аналіз тэкстаў, імправізацыю, эцюды, чытанне па асобах і г. д.

Паэтычныя творы абуджаюць моцныя перажыванні, выклікаюць асаблівую настроенасць душы на ўспрыманне з'яў жыцця. Ім уласціва і своеасаблівая рытмічная мова.

А празаічныя творы звяртаюцца да шырокага агляду жыцця, да аналізу жыццёвых з'яў у іх канкрэтным і вельмі разнастайным праяўленні. Прозе ўласціва схільнасць да разважанняў і пошук адказаў на жыццёвыя пытанні, якія ўздымаюцца ў творы.

Факультатыўны курс «Таямніца паэзіі і загадка прозы», які ўзаемадзейнічае з урокамі беларускай літаратуры, прызваны пашырыць матэрыял падручніка займальнай інфармацыяй, скіраваны на творча-практычнае замацаванне ведаў, уключэнне дзяцей у пошукавую дзейнасць, што не толькі дазволіць паспяхова арганізаваць вучэбны працэс, але і будзе садзейнічаць развіццю эмацыянальнай сферы вучняў.

Прапанаваныя ў праграме творы дапамогуць фарміраваць у школьнікаў сістэму каштоўнасных адносін да жыцця, эстэтычныя ўяўленні, нацыянальную самасвядомасць, пашыраць мастацкі і агульнакультурны кругагляд, увогуле зацікавяць мастацкай літаратурай.

У вучэбнай праграме па беларускай літаратуры ў VII класе звяртаецца ўвага на тое, што «вывучэнне літаратуры на гэтай ступені адукацыі — выхаванне ўдумлівага, дасведчанага чытача, які разбіраецца ў асноўных вартасцях мастацкіх твораў, умее ацэньваць іх змест, інакш кажучы, мае добрае адчуванне і разуменне спецыфікі літаратуры, багаты чытацкі вопыт, уласны эстэтычны густ».

Такім чынам, матэрыял факультатыўных заняткаў прызначаны дапамагчы вучням спасцігнуць жанравую адметнасць паэтычных і празаічных твораў, замацаваць веды па тэорыі літаратуры, актуалізаваць калектыўную самастойную працу на ўроку.

## ПРЫКЛАДНАЕ ПЛАНАВАННЕ ЗАНЯТКАЎ ФАКУЛЬТАТЫВА

| Тэма | Колькасць гадзін | Міжпрадметныя сувязі. Абсталяванне | Творчая работа |
|---|---|---|---|
| *1* | *2* | *3* | *4* |
| **І. Чарадзейная сіла мастацтва.**<br>Творы для вывучэння:<br>◆ Народная казка | **6** | Агульныя родавыя прыкметы ў розных відах мастацтва (музыка, жывапіс, тэатр).<br>Вытокі : хрэстаматыя для пазакл. чытання | Падрыхтоўка паведамлення «Вобраз творцы ў мастацтве: літаратуры, жывапісе, музыцы» |

| 1 | 2 | 3 | 4 |
|---|---|---|---|
| «Музыка-чарадзей»;<br>◆ Генрык Сянкевіч «Янка-музыка»;<br>◆ Змітрок Бядуля «Музыка» | | ў 6 кл. / уклад. М. Лазарук, Т. Логінава, А. Сігаева.<br>Кнігі беларускіх пісьменнікаў. Музычныя запісы. Альбомы жывапісцаў.<br>Творы мастакоў: Мікола Селяшчук «Казачны калейдаскоп» (палатно, алей), В. Сідарава «Казка».<br>Вобразы мастакоў-творцаў у народнай казцы «Музыка і чэрці», літаратурныя творы: М. Багдановіч «Музыка», рускі пісьменнік У. Караленка «Сляпы музыкант» | |
| **II. Акрыленасць паэзіі і разважлівасць прозы.**<br><br><u>Творы для вывучэння:</u><br>◆ Валерый Пазняк «Прыходзіць час святы»;<br>◆ Кастусь Жук «Скрыпка»;<br>◆ Уладзімір Дамашэвіч «Абуджэнне»;<br>◆ Максім Лужанін «Дождж», Янка Сіпакоў «Чым пахне дождж» (урывак з нарыса «Даверлівая зямля»)<br>◆ Паўлюк Трус «Над возерам», Іван Пташнікаў «Возера Нарэч- | **8** | Уладзімір Хадаровіч «Старадрукі» (палатно, алей); Уладзімір Хадаровіч «Нацюрморт са скрыпкай» (палатно, алей); М. Казакевіч «Абуджэнне» (палатно, алей).<br>Раманс М.-К. Агінскага «Абуджэнне». Васіль Шаранговіч «Пасля дажджу» (акварэль); В. Карамазаў «Возера Удомля. Бераг Бялыніцкага-Бірулі» (палатно, алей); М. Рагалевіч «Восень» (палатно, алей);<br>Б. Аракчэеў «Працоўная восень» (палатно, | Работа творчых груп. Тэмы: «У вершаваным слове ўсё!», «Вось яны лёсы людскія!» |

| 1 | 2 | 3 | 4 |
|---|---|---|---|
| ча» (урывак з апавядання «На шчасце»);<br>◆ Пятрусь Броўка «Ах, восень, восень…»; Іван Шамякін «У лесе і ў полі восенню» (урывак з апавядання «Непрыгожая»);<br>◆ Пятро Глебка «Хмаркі», Міхась Лынькоў «Позняя восень» (урывак з апавядання «Недапетыя песні») | | алей); У. Тоўсцік «Восень» (палатно, алей); В. Шкаруба «Увосень» (палатно, алей); В. Сідарава «Метамарфозы восені» | |
| **III. Нам родная песня ў сэрца запала.**<br><br><u>Творы для вывучэння:</u><br>◆ «Прыйдзі, прыйдзі, вясна…»;<br>◆ «Ох, і сеяла Ульяніца лянок...»;<br>◆ «Ах ты, сонца-сонейка…»;<br>◆ «Рабіна, рабіначка…» | **2** | М. Кірэеў. «Свята ў Заслаўі» (палатно, алей).<br>Вытокі : хрэстаматыя для пазакл. чытання ў 6 кл. / уклад. М. А. Лазарук, Т. У. Логінава, А. Р. Сігаева. — Мінск : Ураджай, 1999.<br>Беларускі фальклор: хрэстаматыя / склад. К. П. Кабашнікаў [і інш.]. – Мінск, 1996.<br>Мультымедыя-праектар, ноўтбук, CD-прайгравальнік. Запісы фальклорных песень («Песняры», «Троіца») | Работа творчых груп «Што за дзіва гэтыя песні!» |
| **IV. Загадкавая краіна Паэзія.**<br><br><u>Творы для вывучэння:</u><br>◆ Анатоль Вярцінскі «Дзівак чалавек»;<br>◆ Максім Танк «Паэзія»;<br>◆ «Алег Лойка «Радзіме»; | **7** | Творы жывапісу: Н. Шчасная «Матылёк» (кардон, тэмпера); Ю. Якавенка «Паэт» (афорт) | Выразнае чытанне вершаў вучнямі. Падрыхтоўка паведамлення на тэму «Паэзія пачалася з песні…». Творчыя выказванні дзяцей на тэмы: «Усякая паэзія ёсць выражэнне |

| 1 | 2 | 3 | 4 |
|---|---|---|---|
| ◆ Сцяпан Гаўрусёў «Хлеб-соль»;<br>◆ Рыгор Барадулін «Матылёк» | | | душэўнага стану» (А. Бергсан); «Паэзія — як жывапіс: адзін твор уражвае цябе болей, калі ты будзеш разглядаць яго паблізу, а другі — калі адыдзеш падалей» (Гарацый); «Крыніца ўсякай паэзіі — глыбокае адчуванне невыразнага» (Ж. Арэа). |
| **V. Таямнічае ў звычайным і паўсядзённым.**<br><br><u>Творы для вывучэння:</u><br>◆ Васіль Хомчанка «Звон пад зямлёй»;<br>◆ Якуб Колас «Дзеравеншчына»;<br>◆ Янка Маўр «Палескія рабінзоны»;<br>◆ Алена Васілевіч «Горкі ліпавы мёд» | **12** | У. Сулкоўскі «Спаса-Еўфрасіннеўская царква ў Полацку» (палатно, алей); У. Зінкевіч «Дотык святла»; У. Савіч «Цяплынь»;<br>А. Кашкурэвіч. Ілюстрацыя да кнігі «Яна і я: Вершы і песні пра каханне» (афорт) | Семінар-практыкум: 1. «Роля апісанняў у мастацкіх творах»; 2. «Фантазія пісьменніка».<br>Дзелавыя гульні: рэжысёр, мастак, акцёр. Падрыхтоўка сцэнарыя і інсцэніроўка твора (урыўкаў). |

## МЕТАДЫЧНЫЯ ПАРАДЫ

### I. Чарадзейная сіла мастацтва
### *(6 гадзін)*

***Мэта ўрокаў***: паказаць вучням, як узнікае мастацкая творчасць; пашырыць іх уяўленні пра агульныя і адметныя рысы, уласцівыя розным відам мастацтва (літаратуры, музыцы, жывапісу), выбар тэм і вобразаў. Разгледзець ролю мастацтва ў жыцці чалавека.

Факультатыўны курс прадугледжвае актыўную працу вучняў на занятках, настаўнік жа павінен выступаць у ролі дарадцы, кансультанта.

Спачатку хацелася б, каб вучні разам з настаўнікам паразважалі на тэму «Што ж такое мастацтва?».

У слоўніку мы можам знайсці такое тлумачэнне: мастацтва — творчае аднаўленне, адлюстраванне рэчаіснасці ў мастацкіх вобразах. Жаданне тварыць прыгожае, тлумачыць рэаліі свету ўзнікла ў чалавека яшчэ ў старажытнасці. І ўжо старажытныя філосафы Платон, Арыстоцель спрабавалі характарызаваць віды мастацтва і сістэматызаваць іх. Паводле Арыстоцеля, віды мастацтва адрозніваюцца паміж сабой па прадметах, сродках і спосабах адлюстравання. Па сродках адлюстравання Арыстоцель вылучае мастацтва формы і фарбаў і мастацтва гуку і рытму.

Мастацтва, мастацка-вобразнае адлюстраванне рэчаіснасці народжана на пэўнай ступені развіцця чалавецтва. Мастацтва ўзнікае на аснове праяўлення, фантазіі, з’яўляецца спецыфічнай формай духоўнай дзейнасці. Існуе шмат гіпотэз аб узнікненні мастацтва (з гульні, лагічная гіпотэза і інш.). Патрэбнасць людзей захаваць чалавечы свет, сацыяльны вопыт у пэўных формах і была асноўнай мэтай у працэсе ўзнікнення мастацка-вобразнага адлюстравання рэчаіснасці.

Мастацтва — гэта перш за ўсё зварот да прыгожага. Ён аднолькава ўласцівы літаратуры, музыцы, жывапісу. Гэтая непераможная сіла цудоўнага ў мастацтве яшчэ з часоў філосафаў Арыстыпа, Эпікура, Мантэск’е, Гасендзі, Ламетры, Гольбаха, Гельвецыя і іншых вяла вучоных да тлумачэння многіх чалавечых учынкаў зыходзячы з прынцыпу геданізму (ад грэч. «асалода»), які адносіцца да найбольш старажытнага погляду на прыроду эстэтычнага спасціжэння свету. Але мастацтва акрамя таго, што прыносіць асалоду, робіць нас лепшымі.

Усім творам мастацтва ўласціва форма, але законы ўспрымання для іх неаднолькавыя («Вокам прадмет успрымаецца інакш, чым вухам, і прадмет вока — іншы, чым прадмет вуха»). Форма твораў прасторавых мастацтваў (жывапісу, скульптуры, архітэктуры), якія ўспрымаюцца пры дапамозе зроку, могуць быць зразумелымі і пазнавальнымі як у дэталях, так і цалкам.

Мастацкая літаратура, музыка, жывапіс валодаюць універсальнымі магчымасцямі ўплыву на асобу. Яны аказваюць комплекснае ўздзеянне на мысленне, пачуцці, уяўленні, мараль і густы, выступаюць як дзейсны фактар выхавання асобы. Успрыманне мастацтва мае эмацыянальна-інтэлектуальную прыроду, прадугледжвае

уменне поўна ўспрыняць змест, зразумець выразнасць вобразаў, іх характарыстыку, дадзеную мастаком.

У структуру мастацкага вобраза (літаратурнага, музычнага, жывапіснага) уключаны эмоцыі і пачуцці пісьменніка, мастака, кампазітара, іх роздум аб жыцці. У творчым працэсе аўтар назірае, адбірае неабходны матэрыял, фантазіруе, перажывае, шукае формы выражэння, жанр і сродкі ўвасаблення яго ў мастацкім творы.

Усім творам мастацтва ўласціва пэўная кампазіцыя. Разгляд кампазіцыі — неад'емная частка агульнага аналізу, галоўны сэнс якога — зразумець канкрэтны і спецыфічны змест дадзенага твора, не ўпадаючы ў простае апісанне фармальных элементаў. Кампазіцыйныя прынцыпы ў літаратурных, музычных і жывапісных творах значна адрозніваюцца адзін ад аднаго. Але ў той жа час паміж імі можа быць і шмат падобнага.

Само слова «кампазіцыя» ўтваралася ад лацінскага *compositio* — сачыненне, складанне, размяшчэнне. Кампазіцыя — гэта асноўная форма існавання мастацкіх вобразаў.

Так, у літаратурным творы, напрыклад аповесці, спачатку аўтар паказвае дзеючых асоб, дае апісанне (экспазіцыю, завязку дзеяння), затым ідзе развіццё, кульмінацыя і, нарэшце, развязка, эпілог. Падобныя стадыі вельмі часта робяцца і ў музычным сачыненні: паказ ці экспазіцыя музычнай тэмы ці некалькіх тэм, затым яе (або іх) развіццё, распрацоўка і, нарэшце, — развязка і эпілог — рэпрыза (паўтор) і кода. У музыцы такая форма завецца санатнай.

Але музычная і літаратурная кампазіцыя адрозніваюцца. У музыцы, дзе ёсць свая фабула, няма прадметных абмалёвак, галоўны кампазіцыйны прынцып — паўтор, рэпрыза. Неабходнасць паўтору выклікана ў музыцы самой прыродай гэтага мастацтва: слухаючы музычны твор мы нібы кожны раз параўноўваем новае ў гучанні з яго папярэднім і пасля чарговага праслухоўвання адчуваем увесь твор у цэлым. А зразумець галоўную думку ў ім дапамагае менавіта паўтаральнасць.

У літаратурных творах прынцып рэпрызы не абавязковы, калі гэта не задума аўтара. У лірычных вершах такая паўтаральнасць — прыём, які заўсёды падкрэслівае асаблівую думку аўтара («Песня вольнага чалавека» Я. Купалы, «Вярба» Я. Коласа). Кампазіцыя ў творы выяўленчага мастацтва — свайго роду канструкцыя, дзе выяўленчыя элементы аб'яднаны ў адзінае гарманічнае цэлае. Яе характар заўсёды залежыць ад задумы мастака. Існуюць розныя

яе тыпы (партрэтная, аднафігурная, шматфігурная і інш.). Рухі, жэсты, размяшчэнне герояў на палатне абумоўлены сэнсам твора. Карціна (як і музычны, літаратурны творы) — гэта сачыненне, але сачыненне на мове фарбаў, дзе ўсе зрокавыя сувязі арганізаваны так, што ўтвараюць сэнсавае адзінства. У карціне існуюць як галоўныя так і другарадныя элементы. Асноўным элементам з'яўляецца сюжэтна-кампазіцыйны цэнтр. Менавіта ён выяўляе галоўны змест сюжэта. Слова «цэнтр» не азначае, што ён размяшчаецца непасрэдна ў геаметрычным цэнтры твора. Ён можа знаходзіцца дзе заўгодна (унізе, уверсе, збоку і г. д.), але важна тое, што ў ім засяроджаны асноўны сэнс сюжэта. Вылучэнне галоўнай часткі выявы мастак праводзіць пры дапамозе спецыфічных сродкаў — гэта можа быць, напрыклад, дынамічная група фігур, асноўная дзея, найбольш актыўны колеравы элемент і г. д. Глядач павінен шукаць у сюжэтна-кампазіцыйным цэнтры так званы сэнсавы вузел, дзе завязваецца сюжэт.

Акрамя галоўных існуюць і другарадныя элементы выявы. Яны таксама неабходныя для разумення сюжэта. Нярэдка яны дапаўняюць успрыманне асноўнай выявы пры дапамозе розных атрыбутаў, ствараюць пэўнае асяроддзе (гістарычнае, нацыянальнае і інш.), агульную атмасферу (трагічную, лірычную і інш.). Такім чынам арганізуецца кантэкст, неабходны для разумення агульнай ідэі.

Існуе шмат выяўленчых прыёмаў, пры дапамозе якіх мастакі ўвасабляюць задуму (прыём кантрасту, колер). Прыём кантрасту выяўленчых форм дапамагае зразумець сэнс (цёмнае і светлае, вялікае і малое, дынамічныя і статычныя фігуры, памеры, абрысы і г. д.).

Усё ў прыродзе мае колер. У мастацтве існуе цэлая тэорыя каларыту. Колер — важнейшы сродак у жывапісе і найбольш істотны фактар у кампазіцыі карціны. Колер выяўляе агульны эмацыянальны кантэкст твора. Так, цёмная, стрыманая гама можа падкрэсліваць драматызм сюжэта. Лёгкая і светлая — лірычныя матывы.

Жывапіс — асаблівая мова, якую нельга перакласці на словы, мова, што выяўляе пачуцці, эмоцыі. А пачуцці, эмоцыі ў творах жывапісу перадаюцца пры дапамозе фарбаў розных колераў і адценняў. Радасны настрой, светлыя пачуцці перадаюцца пры выкарыстанні цёплых колераў: жоўтага, чырвонага, аранжавага. Для перадачы суму, маркоты, тугі выкарыстоўваюцца халодныя колеры: сіні, фіялетавы, шэры, цёмна-зялёны. Пры выбары выяўленчых сродкаў мастак, як і пісьменнік, кіруецца галоўнай ідэяй твора, яго тэматычнай

накіраванасцю. У творы жывапісу тэмай з'яўляецца тое асноўнае, што ёсць у карціне. Ідэя ж мастацкага твора — гэта тая галоўная думка, якую выявіў аўтар, дзеля чаго і стваралася палатно.

У музычным творы для паказу сумнага, маркотнага настрою выкарыстоўваецца мінорны лад, а вясёлага, бадзёрага — мажорны. Таксама ж адыгрывае ролю і рытм, тэмп, у якім павінен выконвацца гэты музычны твор.

І ўсё ж такі ёсць адно агульнае, што аб'ядноўвае і жывапіс, і літаратуру, і музыку — усе яны мастацтва. Літаратура ва ўсе часы натхняла мастакоў і музыкантаў. Мастацкі вобраз у жывапісе даваў творчы імпульс паэтам, пісьменнікам, кампазітарам.

**Казка «Музыка-чарадзей»**

***Мэта:*** замацаваць веды пра віды мастацтва і сродкі, якімі яны карыстаюцца; аднавіць звесткі пра казкі і асаблівасці іх будовы; выявіць першаснае ўспрыманне казкі «Музыка-чарадзей»; выпрацоўваць навыкі аналізу твора і ацэнкі паводзін герояў; выпрацоўваць навыкі аналізу і эстэтычнай ацэнкі самастойна прачытанага твора; паказаць блізкасць народнай казкі «Музыка-чарадзей» і твора М. Багдановіча «Музыка»; скласці параўнальную характарыстыку вобразаў галоўных герояў гэтых твораў.

Як эпіграф да ўрока можна выкарыстаць радкі з верша «Скрыпка скардзіцца» Максіма Танка: «Скрыпка скардзіцца за сцяною, то голасна, то ціха ўздыхае...» — ці словы з народнай казкі «Музыка-чарадзей»: «Такі быў той музыка-чарадзей: што захоча, тое з сэрцам зробіць», — альбо словы А. Бергсана: «Калі музыка плача, то разам з ёю плача ўсё чалавецтва, уся прырода».

Пачынаючы работу над народнай казкай «Музыка-чарадзей», настаўнік можа прапанаваць шэраг пытанняў, якія адновяць агульныя веды пра казку і дапамогуць у спасціжэнні асаблівасцей разглядаемай казкі:

♦ Вы ведаеце, што казачныя героі заўсёды змагаюцца са злом і перамагаюць яго, таму пералічыце казачных герояў, якія ўвасабляюць Дабро і Зло;

♦ Якой зброяй традыцыйна змагаюцца са Злом казачныя героі і якую зброю, каб перамагчы яго, выбраў герой казкі «Музыка-чарадзей»? (Вельмі важна, каб вучні назвалі не толькі традыцыйны меч, але і скрыпку, якая ў руках музыкі становіцца зброяй, здольнай перамагчы Зло);

♦ Чым яшчэ, акрамя мяча, перамагалі героі казак? Успомніце казкі, дзе менавіта трапнае слова дапамагала чалавеку. (Казкі «Разумная дачка», «Як Сцёпка з панам гаварыў».)

Для замацавання ведаў пра асаблівасці народных казак настаўнік задае шэраг пытанняў:

♦ Якімі словамі трэба пачаць твор, каб усе зразумелі, што гэта казка?

♦ Да якіх твораў (фальклорных ці літаратурных) адносіцца казка? (Вучні раскажуць, што казкі бываюць фальклорныя і літаратурныя);

♦ Чым адрозніваюцца фальклорныя казкі ад літаратурных?

♦ Па якіх законах будуюцца казкі? (Зачын, сталая канцоўка, характэрныя трохразовыя паўторы, ужываюцца перабольшванні — гіпербалы);

♦ Якія віды казак традыцыйна вылучаюцца? (Чарадзейныя, бытавыя, пра жывёл);

♦ Да якой групы вы аднесяце гэтую казку? Чаму? (Чарадзейная, ёсць элементы незвычайнага, фантастычнага — ведзьмы і чэрці);

♦ Што дапамагло музыку перамагчы ваўкоў?

♦ Якой сілай была надзелена скрыпка?

♦ Прачытайце эпіграф да ўрока. Як вы разумееце яго сэнс?

♦ Назавіце сродак мастацкай выразнасці, ужыты аўтарам у эпіграфе, які дапамагае стварыць вобраз журботнай скрыпкі. Дайце азначэнне ўвасаблення;

♦ Успомніце яшчэ адзін сродак мастацкай выразнасці, які характарызуецца моцным перавелічэннем памераў, уласцівасцей або якасцей;

♦ Знайдзіце ў тэксце і зачытайце, як уздзейнічала гранне музыкі на хлопцаў і дзяўчат, на начлежнікаў. Асобна спыніцеся на эпізодзе, як слухалі музыку мужыкі і бабы;

♦ Як паказана цяжкае жыццё сялян праз успрыманне музыкі? Адказ на гэтае пытанне знайдзіце і зачытайце ў тэксце;

♦ Растлумачце значэнне выразу: «Такі быў той музыка-чарадзей: што захоча, тое з сэрцам зробіць»;

♦ Якімі рысамі надзяляецца ў казцы музыка? Што ў ім звычайнае, чалавечае, а што — чарадзейнае, фантастычнае?

♦ Якія эпізоды твора характарызуюць галоўнага героя як змагара са Злом?

♦ Знайдзіце ў творы радкі, у якіх гаворыцца пра любоў людзей да таленавітага музыкі;

♦ У якім абліччы выступаюць у казцы злыя, цёмныя сілы?

♦ З якімі вобразамі ў казцы звязваецца ўвасабленне прыгожага, а з якімі — агіднага, нікчэмнага, брыдкага?

Абагульняючы выказванні вучняў, настаўнік скажа: «У беларускім фальклоры часта сустракаецца вобраз музыкі-песняра, які нясе народу прыгажосць роднага слова і мелодыі, спявае аб цудоўнай краіне, заклікае на барацьбу за яе шчасце».

Але не толькі ў вуснай народнай творчасці сустракаецца вобраз музыкі. Да яго звяртаюцца і беларускія пісьменнікі;

♦ Назавіце аўтара і твор, дзе галоўным героем з'яўляецца музыка.

Настаўнік, каб узнавіць змест апавядання М. Багдановіча «Музыка» і падрыхтавацца да параўнальнага аналізу галоўных герояў можа прапанаваць у вучням наступныя пытанні:

♦ Якое ўражанне пакінула ў вас апавяданне?

♦ Паспрабуйце вызначыць тэму гэтага твора.

Вучні павінны адказаць, што ў апавяданні пісьменнік расказвае аб вялікай сіле праўдзівага, шчырага слова, якое заклікала «грозна будзіць ад сну». У гэтым творы раскрываецца тэма неўміручасці мастацтва;

♦ Перакажыце сцісла змест апавядання, ужываючы наступныя выразы (яны папярэдне запісаны на дошцы): «балела сэрца, і падступалі к вачам слёзы», «людзі падымалі апушчаныя галовы і гневам вялікім блішчалі іх вочы», «гранне нічога людзям не сказала».

Адказ можа быць прыблізна такі:

«У апавяданні расказваецца пра музыку, які хадзіў па зямлі ды граў людзям на скрыпцы, глыбока кранаў сваім граннем іх сэрцы. Вялікую ўладу над людзьмі мела яго скрыпка. Калі граў ён сумна і жаласна, то "балела сэрца і падступалі к вачам слёзы". А калі моцна, гучна граў музыка, "людзі падымалі апушчаныя галовы, і гневам вялікім блішчалі іх вочы". А ўсе крыўдзіцелі народа трэсліся, як у ліхаманцы. Злыя людзі загубілі музыку, узялі яго скрыпку і пачалі самі граць на ёй. Але іх "гранне нічога людзям не сказала", не прымусіла ў адказ біцца сэрцы»;

♦ Назавіце прычыну, па якой гранне музыкі кранае людскія сэрцы, а гранне паноў — не. Адказ падмацуйце радкамі з тэксту.

Сямікласнікі, напэўна, скажуць, што прычына ў характары грання, у вартасці самой песні. Адказ можа быць прыкладна такі:

«Ніхто не ведаў, што музыка ўсю душу сваю ўкладаў у ігру. Душа яго знала ўсё тое гора, што бачыў ён па людзях; гэта гора грала на скрыпцы, гэта яно вадзіла смыкам па струнах; і ніводзін сыты не мог так граць, як грала народнае гора»;

♦ Знайдзіце ў тэксце твора радкі, у якіх аўтар гаворыць аб неўміручасці мастацтва, якое сваімі вытокамі ідзе ад жыцця і служыць людзям.

Важна, каб вучні знайшлі радкі: «І з-паміж таго народа, катораму ён калісь граў, выйдуць дзесяткі новых музыкаў і граннем сваім будуць будзіць людзей к свету, праўдзе, брацтву і свабодзе».

Параўнальную характарыстыку герояў прапануем арганізаваць у выглядзе цытатнага плана. На выбар настаўніка ён можа быць запісаны ў сшытку або на дошцы. Гэта дае магчымасць правесці работу, улічваючы ўзровень падрыхтаванасці класа; можна зачытаць цытаты з аднаго і другога твора і папрасіць вызначыць рысу характару, якую гэтыя цытаты раскрываюць; можна назваць рысу характару і цытату з аднаго твора, якая раскрывае гэтую рысу, і папрасіць вучняў знайсці цытату ў другім творы; можна назваць тое агульнае, што яднае герояў, і прапанаваць вучням пацвердзіць гэта цытатамі з абодвух твораў. Цытатны план можа быць прыблізна такі:

1. Героі твораў надзелены талентам, яны сваёй музыкай аднолькава ўздзейнічаюць на простых людзей.

«Зноў зайграе дудачка, ужо жаласна. І такая нуда ўсіх ахопіць... І такі іх жаль агорне, што не толькі бабы, а і мужыкі, старыя, барадатыя, плачуць, як па нябожчыку або нібы сынкоў у салдаты праводзяць».

«Плача скрыпка, льюць людзі слёзы, а музыка стаіць і выводзіць яшчэ жаласней, яшчэ нудней. І балела сэрца, і падступалі к вачам слёзы: так і ўдарыўся б грудзьмі аб зямлю ды ўсё слухаў бы музыку, усё плакаў бы па сваей долі...»

2. Героі твораў будзяць народ ад сну, завуць змагацца за сваё шчасце.

«...Бо куды ён ні прыйдзе, там людзі перастаюць паноў слухаць».

«А бывала яшчэ й так, што музыка быццам вырастаў у вачах людзей, і тады граў моцна, гучна: гудзяць струны, звоніць рымка,

бас, як гром, гудзіць і грозна будзіць ад сну і завець ён народ. І людзі падымалі апушчаныя галовы, і гневам вялікім блішчалі іх вочы».

3. Аб’ядноўвае герояў і рэакцыя паноў на іх музыку.

«...Ліхім панам без нажа сэрца рэзаў... Стаў ён ім упоперак дарогі, як костка ў горле».

«Тады бляднелі і трэсліся, як у ліхаманцы, і хаваліся ад страху, як тыя гадзюкі, усе крыўдзіцелі народа».

4. І аднаго і другога героя ліхія паны марацць са свету звесці.

«Надумаліся паны са свету яго звесці. Пачалі падгаворваць аднаго, другога, каб музыку забіў ці ўтапіў».

«Але прыйшоў час, і музыкі не стала: злыя і сільныя людзі кінулі яго ў турму, і там скончылася жыццё яго...»

5. Непадкупнасць талентаў — яшчэ адна рыса, якая яднае герояў.

«Ідзе ён ды ідзе, аж вось падбягаюць да яго два панічы.

— У нас сёння ігрышча, — кажуць. — Пайграй нам, пане музыка. Мы табе заплацім, што захочаш...

“Эге ж, — думае музыка, — дык вось на якое ігрышча зацягнулі мяне панічы! Ну добра. Я ж вам зараз пайграю!”

Наладзіў ён скрыпку, ударыў смычком па жывых струнах — і тут адразу ўсё пекла ў шчэпкі разляцелася, а чэрці з ведзьмамі разбегліся хто куды».

«Многа іх (крыўдзіцеляў народа) хацела купіць у музыкі скрыпку яго, але ён не прадаў яе нікому»;

♦ Дапоўніце характарыстыку герояў;

♦ Назавіце рысы характару героя народнай казкі, якія вы лічыце самымі галоўнымі.

Вучні прыгадаюць смеласць (не пабаяўся ваўкоў і чарцей), спагадлівасць (спыніўся іграць, калі ўбачыў, што нарабіў вадзяны цар) і г. д.

Падводзячы вынікі, настаўнік скажа: «Нашых герояў яднае тое, што яны смелыя, справядлівыя, чулыя і спагадлівыя, заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу. Сваёй музыкай яны выяўляюць пачуцці і думкі ўсяго народа. Менавіта за гэта іх любяць і шануюць простыя людзі».

Абагульніць веды можна наступным пытаннем:

♦ Як вы думаеце, ці можна сказаць, што апавяданне М. Багдановіча «Музыка» напісана пад уплывам народнай казкі «Музыка-чарадзей»? Абгрунтуйце сваю думку, звярнуўшы ўвагу на вобраз героя, сюжэт твора.

Пры рабоце над гэтым пытаннем акцэнтуйце ўвагу на дзвюх праблемах:

— Ці адпавядае твор, навеяны фальклорнымі крыніцамі, духу народнай творчасці?

— Наколькі твор пераасэнсаваны, ці праглядваецца ў ім кола сімпатый і антыпатый аўтара?

Неабходна данесці да вучняў і думку, што зварот да фальклорных твораў гаворыць нам пра цікавасць паэта да народнага жыцця.

**Г. Сянкевіч «Янка-музыка»**

***Мэта:*** выпрацоўваць навыкі вызначэння адносін аўтара да свайго героя, гонар за яго талент; замілаванае ўспрыманне прыроды, уменне бачыць незвычайнае ў звычайным; шляхам параўнальнага аналізу вызначыць падабенства Янкі з Сымонкам — героем урыўка «У яго быў свет цікавы...» з твора Я. Коласа «Сымон-музыка».

Настаўнік звяртаецца да апавядання Г. Сянкевіча «Янка-музыка».

Ва ўступным слове настаўнік можа расказаць пра тое, што польскі пісьменнік Г. Сянкевіч з’яўляецца лаўрэатам Нобелеўскай прэміі, і спыніцца, на гісторыі ўзнікнення гэтай прэміі. Пры неабходнасці настаўнік можа больш падрабязна пазнаёміць вучняў з асобнымі фактамі біяграфіі пісьменніка.

Апавяданне Г. Сянкевіча «Янка-музыка», як і ўсе папярэдне вывучаныя творы, прысвячаецца мастацтву. Гэта адна з пастаянных і найбольш хвалюючых тэм беларускай і сусветнай літаратуры. Вучні пазнаёміліся з апавяданнем самастойна, таму дайце ім магчымасць абмяняцца думкамі пра тое, што здалося найбольш цікавым, пры гэтым неабходна, каб вучні аргументавалі свой выбар. Спроба можа быць недасканалая, але гэта ўжо першая прыступка да свядомага аргументаванага аналізу.

Наступны этап работы над творам — пераказ зместу твора па плану:

1. Дзіця прыйшло на свет слабае і кволае.
2. На восьмым годзе ён быў ужо падпаскам.
3. Янка слухаў... нарэшце ён сам сабе змайстраваў скрыпку з дранак і конскага воласу.
4. Беднае маленькае сэрца дрыжэла ад адной думкі пра сапраўдную скрыпку.

5. Назаўтра бедны Янка стаяў перад судом старасты.

6. Мама, ці будзе ў мяне на тым свеце сапраўдная скрыпка?

Для аналізу твора можна выкарыстаць наступныя пытанні:

♦ Вызначце тэму твора.

Вучні скажуць, што гэты твор пра трагічны лёс таленавітага хлапчука, цяжкае жыццё бедных людзей;

♦ Знайдзіце і зачытайце апісанне знешнасці героя.

Вучні зачытаюць:

«Быў ён худы, загарэлы, жывот уздуты, а шчокі запалыя. Валасы, як лён, амаль белыя, звісалі на выпучаныя светлыя вочкі, якія пазіралі на свет так, нібы ўглядаліся на бяскрайнюю далеч»;

♦ Як праз гэтае апісанне характарызуе аўтар свайго героя? Ці адчуваеце вы аўтарскія адносіны да героя?

Безумоўна, апісанне знешнасці характарызуе героя: выраз «жывот уздуты, а шчокі запалыя...» гаворыць пра хваробу хлопчыка, пра тое, што ён недаядаў, а «светлыя вочкі, якія пазіралі на свет так, быццам угляддаліся на бяскрайнюю далеч», — пра цікавасць і незвычайную ўражлівасць. Увесь вобраз выклікае пяшчоту і спачуванне;

♦ Якія рысы характару героя вам хацелася б выдзеліць?

Наступны этап урока — параўнальны аналіз урыўка «У яго быў свет цікавы...» з паэмы «Сымон-музыка» Якуба Коласа і твора Генрыка Сянкевіча «Янка-музыка»;

♦ Параўнайце ўрывак «У яго быў свет цікавы...» з паэмы Якуба Коласа і апавяданне Генрыка Сянкевіча «Янка-музыка» па тэме.

Сямікласнікі адзначаць, што ў абодвух творах аднолькавая тэма: цяжкае жыццё таленавітых дзяцей і іх імкненне да творчасці, абыякавасць да іх незвычайнай адоранасці і родных, і чужых людзей;

♦ Адшукайце ў тэксце абодвух твораў радкі, у якіх аўтары раскрываюць непаўторнасць успрымання Сымонкам і Янкам навакольнага свету. Зачытайце іх.

Вучні павінны зачытаць наступныя радкі:

На каменьчык сядзе ў збожжы,
Не схіснецца і маўчыць,
Ловіць сэрцам спеў прыгожы,
Як жытцо загаманіць,
Як зазвоняць, заіграюць

Мушкі, конікі, жучкі
І галоўкай заківаюць,
Засмяюцца васількі.
Спеў у сэрцы адклікаўся,
І так добранька было,
Што Сымонка сам смяяўся,
Ўсё смяялася, цвіло.
Заіграў тады хлапчынка,
І здавалася яму,
Што ён знае, як травінка
Сваю думае думу,
Што гаворыць жытні колас...

А герой апавядання «Янка-музыка» чуў музыку ўсюды, ні аб чым іншым і не думаў:

«...Там штосьці ў лесе грала: вой, вой!..

Хвоі, бярозы, птушкі — усё грала. Увесь лес іграў, і ўсё тут. Рэха таксама...

У полі граў яму быльняк, у садзе пад страхою чырыкалі вераб'і, ды так, што вішні гнуліся! Вечарамі слухаў ён галасы на вёсцы і, пэўна, думаў, што ўся вёска грае.

А як паслалі яго на поле гной раскідаць, дык яму нават вецер граў на вілах»;

♦ Якім вы ўяўляеце героя ў той момант, калі ён расказвае, што ў лесе нешта грае? Вусна намалюйце ілюстрацыю да гэтага эпізоду. Перадайце ўнутраны стан героя праз жэсты, міміку, рух;

♦ Ці толькі ўспрыманне свету аб'ядноўвае герояў гэтых твораў? У чым яшчэ вы бачыце падабенства іх лёсаў? Пры адказе карыстайцеся цытатамі з тэксту.

Герояў аб'ядноўвае і тое, што нават ва ўласнай сям'і ім складана, іх не разумеюць, крыўдзяць. Вось як ставіліся да Сымонкі:

Бедны хлопчык быў загнаны,
У бацькоў нялюбы сын,
Бо відочныя заганы
І меў толькі ён адзін.
Не такі, як усе дзеці,
Нейкі вырадак, дзіўны...

Маці Янкі так рэагавала:

«— О то ж я табе зайграю! Дачакаешся ты ў мяне!..

І задавала часам яму трапкачом “музыку”».

♦ Бытавала прыказка: «З музыкі, з дудара не будзе гаспадара». У вусны якіх герояў можна ўкласці гэтыя словы? У чым прычына такога стаўлення да музыкаў?

Вучні, як правіла, абвінавачваюць родных у жорсткасці, абыякавасці да ўласных дзяцей, выносяць прысуд: дарослыя дрэнныя. Настаўнік павінен дапамагчы зразумець, што жыццё сялян (а менавіта сярод іх праходзіла дзяцінства нашых герояў) цяжкае — праца з раніцы да ночы. Маці Янкі, «бедная падзёншчыца, перакідалася з дня на дзень, нібы ластаўка пад чужой страхой». Увогуле, бедныя людзі не мелі часу ўглядацца ў адлёт журавоў ці прыслухоўвацца да таго, што там іграе ў лесе. Так жылі іх бацькі, так жылі яны, такой жа яны бачылі долю сваіх дзяцей. І таму непадабенства да іх саміх і астатніх людзей успрымалася як нешта недарэчнае. Беднасць і беспрасветнае жыццё спусташаюць душы людзей, спараджаюць неразуменне сваіх дзяцей і нават жорсткасць. Але з жыццёвай непрактычнасці не павінна вынікаць раўнадушша да красы, бо ўмець адчуваць прыгажосць не меней важна, чым араць поле, здабываць хлеб. Яны не маглі зразумець сваіх дзяцей яшчэ і таму, што ніхто і ніколі не выхоўваў іх густ, не гаварыў, што акрамя цяжкай працы ў жыцці існуе вялікая радасць сузірання хараства свету і спасціжэнне гэтага хараства і што толькі адораныя натуры здольныя адчуць яго. Таму нельга асуджаць іх, а трэба зразумець, што яны, як і нашы героі, — ахвяры існуючага ладу жыцця, падзелу на гаспадароў і прыгонных. Тым не менш, у апавяданні ёсць героі, якія заслугоўваюць асуджэння; гэта гаспадары маёнтка;

♦ Ці адчуваеце вы адносіны аўтара да гаспадароў маёнтка ў перадапошніх радках апавядання: «Якая цудоўная краіна Італія! Якое шчасце знаходзіць там таленты і дапамагаць ім!»?

Дзеці павінны адчуць горкую іронію гэтых слоў і аўтарскае асуджэнне гаспадароў маёнтка за тое, што яны не здольны разгледзець талент побач і дапамагчы яму, а перакананы, што сапраўднае мастацтва існуе толькі за мяжой.

Важна, каб вучні адчулі жаданне пісьменніка акцэнтаваць увагу на негатыўным у паводзінах тых, ад каго залежыць дапамагчы талентам, а, магчыма, і абудзіць гэтых людзей да міласэрнасці.

У падагульненні павінна прагучаць, што абодва творы — пра нешчаслівае дзяцінства таленавітых хлопчыкаў з тонкім адчуваннем хараства навакольнага свету, яго гукаў і фарбаў.

**Змітрок Бядуля «Музыка»**

***Мэта:*** пашырыць чытацкія ўяўленні вучняў пра адлюстраванне тэмы мастака ў творчасці беларускіх пісьменнікаў; развіваць уменне выбарачна пераказваць празаічны тэкст, характарызаваць і асэнсоўваць паводзіны літаратурнага героя, параўноўваць герояў розных твораў на агульную тэму; узбагачаць уяўленні падлеткаў аб праяўленні мастацкага таленту.

Беларускія пісьменнікі неаднаразова чэрпалі сваё натхненне з фальклору. У многіх народных казках і легендах гаворыцца аб цудадзейнай музыцы, якая ажыўляе, натхняе на творчасць і подзвігі, вылечвае ад хвароб, суцяшае ад гора. Адна з такіх беларускіх казак — «Музыка і чэрці» адносіцца да лепшых узораў сусветнага фальклору.

У казцы «Музыка і чэрці» галоўным героем з’яўляецца бядняк-музыкант, які сваім натхненнем і майстэрствам захапляе і прыроду, і людзей.

Калі зайграе Музыка жаласліва, то «заплачуць і лес, і дуброва, набяжыць хмарка, і з неба слёзкі так і пальюцца», а калі «на вясёлае зверне», то «скачуць малыя дзеці, скачуць коні, скачуць кусты і лес, скачуць зоркі, скачуць хмаркі — усё скача і смяецца».

Змітрок Бядуля творча арыентаваўся на вусную народную творчасць. З яе ён чэрпаў глыбокія думкі і прыўзнята-рамантычныя фарбы для замалёўкі любімых вобразаў і карцін. «Музыка» Змітрака Бядулі працягвае пачатую раней тэму мастака і мастацтва. Пасля твора змешчаны метадычны апарат, які дазволіць настаўніку арганізаваць гутарку з вучнямі па прачытаным творы.

У творы «Музыка» пісьменнік звяртае нашу ўвагу на таленавітага пастушка Васільку, які «з самых малых дзён любіў іграць на жалейцы. Іграючы, яму ніколі не было нудна са статкам сваім у самым дзікім гушчары, на самых глухіх палянах сярод балота».

Вучням прапануецца знайсці апісанне грання пастушком вясёлай песенькі.

Вучні зачытаюць: «Ён іграў і іграў. Так шчыра іграў, ад усёй душы, ажно сам цешыўся, і ўсё навокал яго цешылася». І далей: «Бывала, як зайграе Васілька вясёлую песеньку, дык неба весялілася, сонца

смяялася, дрэўцы ківаліся ў такт. Зляталіся розныя птушкі, збягаліся розныя звяры, спаўзаліся розныя гадзіны слухаць ігру пастушка. Рэхі каціліся ад дрэва да дрэва, ад горкі да горкі, ад лугу да лугу і склікалі ўсіх. Усім істотам было весела і добра ад яго песняў».

Прапануйце вучням падрабязна пераказаць, што адбывалася ў прыродзе, калі гучала сумная мелодыя. Пры гэтым можна прапанаваць выкарыстаць найбольш яскравыя вобразы з тэксту: «краскі слязамі расістымі пакрываліся», «хмаркі затулялі неба», «прыемны смутак-жаль» і інш.

Хлопчык стараўся з усімі падзяліцца сваім талентам, бо «чым болей музыкаў было вакол, тым болей ён радаваўся». Васілька чэрпаў сваё натхненне з прыгажосці роднай зямлі — «жывой зямелькі са сваімі рознакаляровымі краскамі, траўкамі, дрэвамі і серабрыстымі крынічкамі», «блактнага неба са сваімі свечкамі-зоркамі, размаітымі хмаркамі, пераліўнымі зарніцамі і фарбамі».

У Васількі былі таленавітыя вучні, адзін з іх, самы найлепшы, салоўка — «шэры жэўжык», які «слаўныя трэлі» выводзіў, што «не толькі блізкія істоты, але і далёкія зоркі ў небе слухалі з прыемнасцю і перамігваліся ад дзіва паміж сабой». Другім вучнем быў жаваранак — «не такая здольная птушачка», але «з гразом папалам… патрапіў бы іграць вяселле лёгкім хмаркам пад вясновым небам над свежым, пуховым чарназёмам».

Усё наваколле мела сваю цудоўную музыку, і аднойчы хлопчыку падалося, што «ўсе стварэнні на зямлі і сама зямля ігралі і спявалі, кожны на свой лад, на тысячы-тысячы галасоў» і нагадвалі «велізарную скрыпку з незлічона многімі струнамі».

Як бывае ў добрых народных казках, такую прыгажосць не магло не заўважыць сонейка. Яно надзяліла ўсю прыроду і Васільку сваёй цеплынёй.

«Спусцілася сонейка з неба на сваіх лёгкіх прамяністых скрыдлах і пацалавала маленькага хлопчыка ў самыя вусны. Пацалунак быў такі лёгкі, што пастушку здалося, нібы кволы ветрык толькі крануўся яго твару. Пацалунак быў такі шчыры, што хлопчык да самай магілы аб ім не забудзе».

Настаўнік разам з вучнямі абмяркуюць галоўную ідэю твора. Пісьменнік невыпадкова паказаў у сваім творы як мастацтва, талент, творчасць могуць зрабіць сусвет лепшым, і ў гэтым яго (мастацтва) чарадзейнасць. Гэтая ідэя была і ў папярэдніх творах, якія вывучаліся ў раздзеле «Чарадзейная сіла мастацтва».

## II. Акрыленасць паэзіі і разважлівасць прозы
***(8 гадзін)***

***Мэта:*** развіваць здольнасць адклікацца на паэтычнае ўспрыманне свету, якое выяўляецца праз прыёмы і сродкі мастацкай выразнасці; вучыць заўважаць дэталі і перадаваць іх, выкарыстоўваючы прыём вуснага малявання; пашыраць слоўнікавы запас вучняў; выпрацоўваць навыкі выразнага чытання; параўнаць паказ аднолькавай з'явы прыроды ў паэтычных і празаічных творах, звярнуць увагу на тое, як адрозніваюцца па знешніх адзнаках, па мове, па спосабах, прыёмах і сродках створаныя вобразы ў розных відах літаратурнай мастацкай творчасці.

Пачаць урок можна з пытання, якое абагульніць веды, атрыманыя на ўроках беларускай літаратуры і факультатыўных занятках:

♦ На што была скіравана ўвага пры вывучэнні твораў I раздзела, аб'яднаных агульнай назвай «Чарадзейная сіла мастацтва»?

Вучні адкажуць, што на папярэдніх уроках высвятлялі асаблівасці літаратуры як віду мастацтва.

Настаўнік коратка спыніцца на двух відах твораў — паэзіі і прозе, якія разам складаюць мастацкую літаратуру.

Увядзенне ў спецыфіку мастацкай літаратуры працягнецца на параўнальным аналізе (разглядзе) двух асноўных відаў літаратуры — паэзіі і прозы. Гэта значыць, што будуць разглядацца падобныя па тэме творы ў вершах і ў прозе (што і падказвае назва раздзела). Блізкія ідэйна-тэматычна творы будуць параўноўвацца для вызначэння асаблівасцей кожнага з відаў.

Пачынаецца разгляд з вершаваных твораў «Прыходзіць час святы» В. Пазняка, «Скрыпка» К. Жука і празаічнага твора «Абуджэнне» У. Дамашэвіча, якія расказваюць пра незвычайную адоранасць людзей. Таленавітыя мастакі-музыкі, незвычайна адораныя ад прыроды, здольны сваім талентам «абудзіць» чалавека. Пад уздзеяннем іх музыкі адступае будзённасць і нараджаецца прыгажосць.

Вучні павінны ўсвядоміць, што толькі чалавек, надзелены прыроднай здольнасцю і паэтычным майстэрствам, які сам умее заўважаць прыгажосць, можа перадаць яе ў сваіх творах.

Наступны этап урока — знаёмства з творамі В. Пазняка «Прыходзіць час святы», К. Жука «Скрыпка».

Ад першаснага ўспрымання твора залежыць, закране ён душу ці пакіне абыякавым, таму твор чытае падрыхтаваны вучань або

настаўнік. Да вершаў не давайце папярэдніх заданняў, вучні павінны ўслухоўвацца ў паэтычны тэкст, асэнсоўваць яго.

Работа над творамі можа быць праведзена па наступных пытаннях:

♦ Ці спадабаўся вам гэты верш? Якія пачуцці ён выклікаў?

♦ Якія вобразы, створаныя паэтам, здаліся вам найбольш цікавымі?

♦ Пракаменціруйце наступныя радкі тэксту верша В. Пазняка «Прыходзіць час святы»:

Прыходзіць час святы, прыходзіць
Калі святло ў душы ўзыходзіць
І свет ратуе прыгажосць,

— і К. Жука «Скрыпка», у якім галоўны герой Марцін «выпешчваў гэтакія зыкі — // Дых перахватвала ажно»:

Ото і граў ён! Божа мой...
Здавалася:
гусей чароды
Плылі ў палоне асалоды
І пошум крыл — над галавой.

♦ З дапамогай якіх вобразна-выяўленчых сродкаў створаны мастацкія вобразы ў гэтых вершаваных творах?

Гэта пытанне будзе насіць агульны характар і пры неабходнасці можа быць разбіта на больш дробныя і канкрэтныя:

а) Успомніце значэнне паняцця «эпітэт» (пры неабходнасці звярніцеся да слоўніка). Вызначце яго ролю ў вершы.

б) Знайдзіце і зачытайце ў вершы радкі, у якіх вобразы створаны з дапамогай параўнання.

Настаўнік яшчэ раз звяртае ўвагу на тое, што вобразна-выяўленчыя сродкі дапамагаюць паэтам стварыць яркія, запамінальныя вобразы мастака-музыкі, які прыціскае, як дзіця, да сэрца скрыпку і які здольны ўвесці чалавека ў такі стан, што ён стаіць, «...не ведаючы, што цябе трымае, не пускае».

♦ Як бы вы вызначылі адносіны паэтаў-мастакоў да таго, пра што яны пішуць?

Наступны этап урока — выразнае чытанне вершаў.

Знаёмства з празаічным творам «Абуджэнне» У. Дамашэвіча і супастаўленне яго з вершамі «Скрыпка» і «Прыходзіць час святы».

♦ На якой падставе можна параўнаць гэты празаічны твор з вершамі К. Жука і В. Пазняка?

Настаўнік вызначае мэту — параўнаць гэтыя творы па знешніх адзнаках, па мове, па спосабах, якімі карысталіся аўтары, ствараючы вобразы таленавітых музыкантаў.

♦ Зачытайце радкі, у якіх перададзена віртуознае гранне скрыпачкі:

«Яна (скрыпка) жыла, дыхала... Смычок, як прыліпшы да струнаў, то плаўна перабягаў справа налева, то вяртаўся зноў...», «Скрыпка спявала і плакала, смяялася і галасіла наўзрыд, уздыхала, шаптала і ўмольвала, яна злавалася, загадвала і праклінала...»

Вызначце ролю дзеясловаў у гэтым урыўку.

♦ Знайдзіце радкі, у якіх даецца ацэнка таленту скрыпачкі.

«Калі скрыпачка пайшла танцаваць, нешта змянілася ў самой ігры аркестра: чамусьці адразу збяднеў і аркестр, нечага ў ім стала бракаваць і, здаецца, ці не самага галоўнага... Так, не хапала ў ім душы, не хапала таго агню, таго высокага напалу, які прыносіць сапраўднае натхненне. Такі праўда: шумеў лес, толькі не было ў ім салаўінай песні, і не было ансамбля».

♦ Знайдзіце радкі, у якіх перададзена ўздзеянне музыкі на героя-апавядальніка.

«Пасля той музыкі я доўга быў сам не свой, жыў як у сне. Я спыняўся сярод дарогі, вочы мае самі заплюшчваліся, і я выразна чуў музыку, толькі трохі прыглушаную адлегласцю, нібы яна даходзіла да мяне праз якую не надта шчыльную перагародку. Музыка была ў маёй галаве, ва ўсёй маёй істоце, яна перапаўняла мяне да краёў».

♦ Якую ролю ў творы адыгрываюць успаміны і разважанні героя?

♦ Чым адрозніваецца апісанне ўздзеяння музыкі ў празаічным творы ад паэтычнага апісання?

Вучні павінны адзначыць, што ў празаічным творы вобразы ствараюцца з дапамогай падрабязных апісанняў. Гэта і аўтарскае апісанне, і ўспаміны героя-апавядальніка.

♦ Ці аднолькавую ролю ў стварэнні вобразаў у паэтычным і празаічным творы выконваюць вобразна-выяўленчыя сродкі?

Вучні павінны ўсвядоміць, што ў вершаваных творах В. Пазняка «Прыходзіць час святы», К. Жука «Скрыпка» моцнае ўражанне на чытача дасягаецца ўжываннем шматлікіх вобразна-выяўленчых сродкаў.

У празаічным творы У. Дамашэвіча «Абуджэнне» таксама ўжываюцца сродкі мастацкай выразнасці, але яны застаюцца як бы незаўважанымі, бо не на гэтым акцэнтуе ўвагу аўтар. Галоўнае ў празаічным творы — дакладнае апісанне з'явы, таму аўтар акцэнтуе ўвагу на шматлікіх падрабязнасцях. Такім чынам, можна зрабіць вывад, што адна і тая ж з'ява ў паэтычным і празаічным творы раскрываецца па-рознаму.

Каб замацаваць гэтыя веды, прапануюцца паэтычныя і празаічныя творы, якія апісваюць адну і тую ж з'яву прыроды: М. Лужанін «Дождж» — Я. Сіпакоў «Чым пахне дождж?»; П. Трус «Над возерам» — І. Пташнікаў «Возера Нарэчча»; П. Броўка «Ах, восень, восень...» — І. Шамякін «У лесе і ў полі восенню»; П. Глебка «Хмаркі» — М. Лынькоў «Позняя восень».

Мастакі слова прымушаюць заўважаць тое незвычайнае ў прыродзе, на што ў паўсядзённым жыцці мы не звяртаем ўвагі, а дзякуючы іх таленту ў мастацкім творы адкрываем для сябе.

Абагульніць веды дапаможа і наступнае пытанне:

♦ Калі параўнаць вершаваныя і празаічныя творы з творамі музыкі і жывапісу, то якія з іх, на вашу думку, бліжэй да музычных твораў, а якія — да твораў жывапісу?

## III. Нам родная песня ў сэрца запала
### *(2 гадзіны)*

***Мэта:***аднавіць веды і ўяўленні вучняў пра народна-песенную творчасць, атрыманыя ў папярэдніх класах, паглыбіць веды вучняў пра сувязь песеннага фальклору і літаратурных паэтычных твораў, яго ўплыў на творчасць пісьменніка; узбагаціць веды вучняў пра беларускія народныя песні; паказаць адметнасць песень у выяўленні душы народа-паэта; аднавіць раней набытыя веды пра сувязь народных песень з абрадамі і звычаямі; выхоўваць любоў да народных песень.

Беларуская народная песня жыве шмат стагоддзяў. У гуках яе мелодыі, простых, але такіх прачулых словах захавалася душа нашых продкаў, іх думкі, пачуцці.

Песенна-народная творчасць беларусаў даволі разнастайная. Дзеці ўжо знаёміліся ў VI класе з каляндарна-абрадавымі і пазаабрадавымі песнямі, іх мастацкімі асаблівасцямі. Аднавіць веды, набытыя ў мінулым годзе, дапамогуць пытанні:

- ♦ Чаму беларуская песня называецца народнай?
- ♦ З якімі песнямі вы пазнаёміліся ў мінулым годзе?
- ♦ Калі яны спяваліся?
- ♦ Якія мастацкія адметнасці народных песень вам запомніліся?

Настаўнік скажа, што беларуская народная песня аказала вялікі ўплыў на станаўленне і развіццё беларускай літаратуры. Таленавітыя майстры слова Янка Купала, Якуб Колас, Францішак Багушэвіч, Максім Багдановіч чэрпалі натхненне з глыбінь нашай фальклорнай спадчыны. Паэты творча пераасэнсоўвалі тэмы і вобразы беларускага фальклору, выкарыстоўвалі яркія і запамінальныя сродкі мастацкай выразнасці, бо песня — невычэрпная крыніца натхнення.

Народныя песні валодаюць магічнымі чарамі эмацыянальнага ўздзеяння, бо яны, паводле выказвання В. Брусава, «абточаныя акіянам народнай душы». Беларускі паэт і даследчык фальклору Ніл Гілевіч пісаў аб значэнні песеннай творчасці народа для развіцця сучаснай паэзіі. Вось што ён гаварыў: «Бясспрэчна, што паэзія нашых дзён усё больш смела выходзіць на плённы шлях... выкарыстання прынцыпаў рыфмоўкі, дасканала распрацаваных у фальклоры. Вялікія магчымасці адкрываюцца перад ёю ў гэтым кірунку. Таму і лічым, што наша запрашэнне бліжэй заглянуць у паэтычную майстэрню народа — гэта арыентацыя не назад, у мінулае, а наперад, у будучае. Якімі шляхамі ў творчасці лепш ісці — народная паэзія падкажа нам яшчэ не аднойчы»[1].

Народныя песні складаюць частку фальклорнай спадчыны нашага народа. Але гэтая частка мае такую асаблівасць, якая вылучае яе сярод іншых вусна-паэтычнах твораў, — уздзейнічае на пачуцці людзей. У песнях занатаваны летапіс жыцця народа. Яна была для сялян не толькі спадарожніцай у жыцці — ад першых матчыных калыханак, шлюбных песень да галашэнняў на пахаваннях. З дапамогай песень нашы продкі перадавалі жыццёвы і працоўны

---

[1] Гілевіч, Н. С. Паэтыка беларускай народнай лірыкі / Н. С. Гілевіч. — Мінск., 1975. — С. 283—284.

вопыт, пачуцці, якія хвалявалі іх у розныя часіны. Мелодыя вельмі ўзбагачае тэкст песень, а варыянтаў спявання песень было столькі, колькі выканаўцаў. Кожны з іх укладаў у простыя і прачулыя радкі нешта сваё, асабістае.

Каб песні не забыліся, іх пачалі запісваць. Першыя запісы былі зроблены яшчэ ў XIX стагоддзі М. Федароўскім, П. Шэйнам, А. Сержпутоўскім. Сярод сучасных вядомых даследчыкаў беларускай песні можна вылучыць Р. Шырму, Н. Гілевіча, Г. Цітовіча.

Нашы сучаснікі могуць сустрэцца з беларускай народнай песняй на канцэртах у выкананні народных калектываў, ансамбляў, спевакоў.

Вось што сказаў пра беларускую песню народны артыст Беларусі Міхась Дрынеўскі: «Спакон вякоў Белая Русь заручана з песняй. І з песняй народнай — каляндарна-абрадавай, бытавой, лірычнай і жартоўнай, і з песняй прафесійнай, створанай кампазітарамі. Ашчодраная багаццем гукаў і фарбаў, яна напаўняе людскія сэрцы непагаснай любоўю да роднай зямлі, непаўторнай і адметнай прыгажосці яе прыроды».

Варта даць паслухаць адну-дзве песні ў выкананні ансамбля «Песняры» або этнагурта «Троіца».

Наступны этап урока — чытанне і аналіз песень «Прыйдзі, прыйдзі, вясна...», «Ох, і сеяла Ульяніца лянок...», «Ах ты, сонца-сонейка...», «Рабіна, рабіначка...». Дапамогуць праверыць чытацкае ўспрыманне наступныя пытанні:

♦ Ці спадабаліся вам песні, чым?
♦ Якія пачуцці перадаюць песні?
♦ Якія малюнкі ўзніклі пры чытанні?

Песні розныя па настраёвасці, спяваліся ў розны час, таму пасля агульнага абмеркавання трэба спыніцца на кожнай паасобку.

**«Прыйдзі, прыйдзі, вясна...»**

Пасля паўторнага чытання варта спыніцца на наступных пытаннях:

♦ Якім настроем прасякнута песня?
♦ З дапамогай якіх мастацкіх сродкаў у песні перадаюцца меладычнасць, мяккасць?
♦ Што можна сказаць пра чалавека, які склаў гэтую песню?
♦ На якое свята магла спявацца гэтая песня?

♦ Прыгадайце песні, з якімі вы пазнаёміліся ў мінулым годзе, прысвечаныя гэтай пары года. Параўнайце іх.

Вучні адкажуць, што песня спявалася ўвесну. Людзі пасля доўгіх зімовых месяцаў чакалі вясну, таму запрашэнне яе павінна было быць радасным, святочным. Аўтар песні добра адчуваў слова, быў творчым чалавекам. Песня багатая на сродкі мастацкай выразнасці: паўторы (*прыйдзі, прыйдзі; прынясі, прынясі; вязе, вязе*)*;* сталыя эпітэты (*вясна-красна, залаты конь, зялёны саян, сыра зямля, ясныя дзянёчкі, чыстыя дажджочкі, зялёныя травы, красныя цвяточкі*)*;* памяншальна-ласкальныя формы слоў (*таночак, вяночак, дзянёчак, дажджочкі, цвяточкі*)*;* адухаўленне прыроды (вясна *едзе, седзячы, аручы, сеючы, скародзячы;* вясна *вязе*).

Вучні раскажуць, што яны ведаюць пра абрад запрашэння вясны. Успомняць песню «Благаславі, маці, вясну заклікаці...», якую вывучалі ў 6-м класе. Ва ўсіх песнях-вяснянках прысутнічае вобраз вясны. Вясна ўяўляецца нам маладой прыгожай жанчынай. Гэтаму дапамагае мастацкі сродак — увасабленне. А змест песні таксама вельмі лёгка тлумачыцца. Вясну чакаюць, бо з яе прыходам абуджаецца ўсё жывое, пачынаюцца земляробчыя працы, расцвітаюць кветкі. Безумоўна, *залаты конь* — сонейка, якое сваім цяплом абуджае зямлю, *зялёны саян* — маладая лістота, якая пакрывае галінкі дрэў. З прыходам вясны пачынаюцца:

Ясныя дзянёчкі,
Чыстыя дажджочкі,
Зялёныя травы,
Красныя цвяточкі
Нам на вяночкі.

Самым распаўсюджаным мастацкім сродкам, які дапамагае паэтычна-вобразна адлюстраваць рэчаіснасць, з'яўляецца эпітэт — мастацкае азначэнне. У традыцыйнай народна-песеннай творчасці, асабліва ў каляндарна-абрадавай, амаль кожны прадмет ці з'ява характарызуецца якім-небудзь эпітэтам: поле — *шырокае,* ніўка — *залатая,* вясна — *красна* і г. д. Выкарыстанне эпітэтаў падпарадкавана пэўным эстэтычным за-

дачам: робячы песню больш паэтычнай, у мастацкіх адносінах — больш дасканалай, эпітэт гэтым самым узмацняў сілу яе эмацыянальнага ўздзеяння, дапамагаў глыбей і паўней раскрыць яе змест.

**«Ох, і сеяла Ульяніца лянок...»**

У гэтай песні адлюстроўваецца праца. Працоўныя песні аб’ядноўвалі людзей, з імі спарней і весялей працавалася. Мелодыя і рытм гэтых песень цесна звязаны з характарам і рытмам выконваемай працы. Адны песні спяваліся ў час сенакосу, другія — у час жніва і г. д.

Калі ёсць магчымасць, трэба даць паслухаць песні ў выкананні Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору Беларусі імя Г. І. Цітовіча. Гэта — адзін з вядучых музычных калектываў рэспублікі, у яго рэпертуары шмат беларускіх народных песень, большасць з якіх была запісана і захавана для нашчадкаў вядомым фалькларыстам, руплівым даследчыкам Г. І. Цітовічам. Песня «Ох, і сеяла Ульяніца лянок...» таксама захавалася дзякуючы яму.

Спявалася песня хутка, весела. Яе рытмічнасць дапамагала ў працы. Пасля кожнага запева-двухрадкоўя ішоў прыпеў:

Ох, сэрца лянок,
Мая радасць ты, лянок,
Ўсё бялюсенькі кужалёк!

Кожны радок пачынаецца з выгуку *ох.* Ён нібы дапамагае выканаўцу (працаўніку) пазбавіцца ад стомы і хутчэй зрабіць сваю справу.

Уся песня «Ох, і сеяла Ульяніца лянок...» пабудавана на паўторы — адным з распаўсюджаных у народных песнях стылёвамоўных сродкаў мастацкай выразнасці.

**«Ах ты, сонца-сонейка...»**

У гэтай песні паказваецца, як цяжка працуюць жанчыны ў час жніва: з усходу і да заходу сонца.

Песня ўзнікла ў далёкія прыгонныя часы. Жанчыны-жнейкі працавалі на паноў, таму і па настроі яна такая сумная. Песня

«Ах ты, сонца-сонейка...» адносіцца да каляндарна-абрадавых, спявалася ў час жніва.

Дзяўчына-жнейка скардзіцца сонейку на сваю горкую долю і ў той жа час вінаваціць яго, што яно «раненька ўсходзіць» і «позненька заходзіць». Сонейка спачувае жнейцы і тлумачыць, хто вінаваты ў яе цяжкай долі:

Не вінуй жа ты мяне,
Вінуй жа свайго пана:
Хоць я раненька ўзыду,
Цябе на ніўцы знайду...

У гэтай песні таксама шмат вобразна-выяўленчых сродкаў мовы, характэрных для народных песень. Гэта паўторы: *сонца-сонейка, дзеўка-дзеванька,* — памяншальна-ласкальныя формы слоў: *сонейка, дзеванька, раненька,* — зварот да прыроды як да жывой істоты, прыём адухаўлення.

**«Рабіна, рабіначка...»**

У гэтай песні расказваецца пра нешчаслівую долю маладой жанчыны. Вобраз рабіны ў беларускіх народных песнях мае сімвалічнае значэнне — маладая дзяўчына ці адзінокая або няшчасная ў замужжы жанчына. Вобраз рабіны сустракаецца ў песнях пазаабрадавых, асабліва ў любоўных і пра жаночую долю.

Дзеці чытаюць песню ў класе яшчэ раз.

Гэтая песня — споведзь маладой жанчыны, якой цяжка жывецца ў «чужой сямеечцы», з няроднымі бацькамі:

Дальняя староначка
Без ветру сушыць,
Не родны татулечка
Без віны журыць.

Перадаць журботны настрой у песні дапамагаюць сродкі мастацкай выразнасці.

Паэтычная сімволіка — самы распаўсюджаны матэрыял, які дапамагае вывучэнню мастацкага стылю народных песень, а таксама разуменню прыроды фальклору, характэрных і спе-

цыфічных асаблівасцей мастацкага мыслення народа. Каліна, рабіна, вярба, бяроза — вобразы вельмі тыповыя і характэрныя для сімволікі беларускіх народных песень.

Каліна ў беларускіх народных песнях сімвалізуе дзяўчыну на выданні, нявесту; рабіна — нешчаслівую ў замужжы жанчыну; бяроза — нявесту; вярба — гаротную жанчыну, разлучаную з бацькоўскім домам. Праз вобразы-сімвалы, у якіх так ярка адлюстроўваўся свет роднай прыроды, уклад грамадскага жыцця, мы даведваемся пра светапогляд, маральныя перакананні нашага народа.

У песні таксама шмат сталых эпітэтаў, якія ўстойліва замацаваліся за тым ці іншым прадметам або з'явай і азначаюць іх характэрныя якасці (*чужая* сямеечка, *родны* татулечка, *дальняя* староначка). Асаблівую мілагучнасць і пачуццёвасць надаюць песні словы з памяншальна-ласкальным значэннем: *рабіначка, дзяўчыначка, поранька, вёсачка, сямеечка, староначка, татулечка, гадочак* і г. д.

У беларускай народнай лірыцы знайшла адлюстраванне сімволіка лічбаў. За некаторымі лічбамі яшчэ з часоў старажытнасці замацаваны пэўны сімвалічны сэнс. Яны валодаюць цудадзейнай, магічнай сілай. У беларускім песенным фальклоры гэта *тры, сем, дзевяць.* Асабліва часта сустракаецца лічба тры:

Вось жыву гадочак я.
Жыву і другі,
А на трэцім годзіку
Занудзілася.

Адным з характэрных і яркіх выяўленняў эстэтычных суадносін чалавека і прыроды з'яўляецца вобразны паралелізм.

Рабіна, рабіначка,
Рабіна мая.
Чаму ж ты, рабіначка,
Рана адцвіла?

Першы слупок рыхтуе чытача (слухача) да адпаведнага ўспрыняцця таго галоўнага, што раскрываецца ў другой частцы вобразнай паралелі:

Дзяўчына, дзяўчыначка,
Дзяўчына мая,
Чаму ж ты, дзяўчыначка,
Засмуцілася?

Праз вобраз рабіны мы лепш спасцігаем «чалавечы змест» песні, псіхалагічна глыбей ужываемся ў яго, мацней суперажываем.

## V. Загадкавая краіна Паэзія
*(7 гадзін)*

***Мэта:*** даць вучням магчымасць адчуць прыгажосць, мілагучнасць беларускай паэзіі, разнастайнасць яе тэматыкі. Такое «паглыбленне» ў непаўторны і чароўны свет паэтычнага слова будзе спрыяць развіццю цікавасці падлеткаў да лірыкі.

Цікавасць да паэзіі — адзін з паказчыкаў духоўнасці, эмацыянальнай чуласці, без якой цяжка ўявіць сабе чуласць маральную. Сучасны школьнік увогуле мала чытае мастацкіх твораў, а што да паэзіі, то яна запатрабавана невялікай часткай вучняў. Гэтая праблема неаднаразова адзначалася метадыстамі, літаратуразнаўцамі, вучонымі. Паэзія адносіцца да складанага па ўспрыманні роду літаратуры, і гэта павінна ўлічваецца ў школьным выкладанні.

Галоўныя задачы настаўніка пры вывучэнні гэтага раздзела — дабіцца суперажывання і суроздуму з паэтам, раскрыць сілу і глыбіню пачуццяў і думак, сфарміраваць чытацкія якасці вучняў, неабходныя для паўнавартаснага ўспрымання лірыкі: эмацыянальную чуласць, вобразнае, асацыятыўнае мысленне, эстэтычную рэакцыю на мастацкае слова.

Кожны паэтычны твор нясе ў сабе свой «мікракосм пачуццяў», роздумаў, вобразаў, патрабуе асаблівага падыходу, інтанацыі, логікі разбору. Вывучэнне твораў паэтычнага мастацтва — таксама мастацтва. На занятках важна ўсё: натхненне і педагагічны разлік, думка і пачуццё, інтанацыя, адценні голасу, жэст. Урок павінен быць пабудаваны так, каб вучні маглі спасцігнуць паэтычны вобраз, зразумець і адчуць тое, што было створана пісьменнікам у хвіліны найвышэйшага душэўнага ўздыму.

Пералічым асноўныя прынцыпы пабудовы ўрока па вывучэнні паэтычных твораў:

1. Уступная частка. (*Мэта*: наблізіць чытача да стану, перажытага паэтам, падрыхтаваць да ўспрымання вершаў. *Матэрыял*: гісторыя стварэння верша, кароткі эмацыянальны аповед пра пісьменніка, творы музыкі і жывапісу);

2. Знаёмства з вершам. Першаснае чытанне. (*Мэта*: выклікаць эмацыянальны водгук на верш, высветліць першаснае чытацкае ўспрыманне і ўражанне.)

Пытанні:

♦ Ці спадабаўся верш?

♦ Якія пачуцці ўсхвалявалі?

♦ Якія малюнкі ўзніклі пры чытанні?

3. Аналіз верша. (*Мэта*: пазнаёміць вучняў з настроем, інтанацыяй верша, дапамагчы спасцігнуць паэтычны вобраз і сродкі яго выражэння.)

Пытанні:

♦ Якія пачуцці выражаны ў вершы?

♦ Як мяняецца настрой, інтанацыя на працягу верша?

♦ З дапамогай якіх мастацкіх сродкаў паэт перадае свае жыццёвыя ўражанні?

♦ Што можна сказаць пра паэта, якім вы яго ўяўляеце?

♦ На які роздум наводзіць верш, якія пачуцці выклікае?

♦ У якіх вершах раскрываецца блізкая або падобная тэма? Параўнайце вершы;

4. Работа над выразным чытаннем. (*Мэта:* навучыць дзяцей уважліва, выразна чытаць вершы, перадаючы настрой і інтанацыю, выпрацаваць уменне ўслухоўвацца і ўдумвацца ў паэтычныя радкі.)

Такім чынам, можна прапанаваць наступную сістэму ўрокаў па вывучэнні раздзела «Загадкавая краіна Паэзія»:

- Урок 1. Уводзіны. Загадка паэзіі. Глыбокае адчуванне невыразнага.
- Урок 2. Анатоль Вярцінскі «Дзівак чалавек»;
- Урок 3. Максім Танк «Паэзія»;
- Урок 4. Алег Лойка «Радзіме»;
- Урок 5. Сцяпан Гаўрусёў «Хлеб-соль»;
- Урок 6. Рыгор Барадулін «Матылёк»;
- Урок 7. Падагульненне па раздзеле.

## Урок 1. Уводзіны. Загадка паэзіі. Глыбокае адчуванне невыразнага

***Мэта:*** дапамагчы вучням зразумець мнагазначнасць паняцця «паэзія», пашыраць веды вучняў пра разнастайнасць тэматыкі паэтычных твораў.

На пачатку ўрока можна прапанаваць вучням выказванні пра паэта, паэзію:

- Паэзія — помнік, у якім увасоблены лепшыя і найбольш шчаслівыя імгненні самых лепшых і найшчаслівейшых розумаў. *(П. Шэлі)*;
- Усякая паэзія ёсць выражэнне душэўнага стану. *(А. Бергсан)*;
- Крыніца ўсякай паэзіі — глыбокае адчуванне невыразнага. *(Ж. Арэа)*;
- Паэт ёсць сусвет, адным чалавекам аб’яднаны. *(В. Гюго)*;
- Паэт — гэта філосаф канкрэтнага і жывапісец абстрактнага. *(В. Гюго)*
- Вопыт — аснова паэзіі. *(Г. Гаўптман)*
- Паэзія — як жывапіс: адзін твор уражвае цябе болей, калі ты будзеш разглядаць яго паблізу, а другі — калі адыдзеш далей. *(Гарацый)*;
- Музыкант і паэт успрымаюць жыццё слухаючы. *(Б. Асаф’еў)*;
- Сачыненне вершаў — гэта не праца, а стан. *(Р. Музіль);*
- Паэта нараджае не дар творчага вымыслу, а дар адухаўлення. *(Т. Ман)*

Пачаць размову можна з уступнага слова настаўніка пра паэзію і яе ролю ў нашым жыцці. Загадка паэзіі хвалявала і зараз хвалюе пісьменнікаў, літаратуразнаўцаў, таленавітых і вядомых дзеячаў мастацтва і навукі. Ёй прысвечаны вершы, апавяданні, выказванні. Настаўнік зачытвае выказванні пра паэзію і паэта, а потым прапаноўвае вучням адказаць на пытанні:

♦ Хто такі паэт?

♦ Як вы думаеце, чаму ў паэтаў узнікае жаданне пісаць вершы?

Магчыма, вучні адкажуць, што паэт — гэта чалавек, які можа складаць вершы, пісаць у рыфму. Але не заўсёды чала-

век становіцца паэтам толькі таму, што піша ў рыфму. Ён стварае вершы, бо як асоба надзелены нейкімі сваімім адметнымі якасцямі душы. Паэт успрымае навакольны свет абвострана, асобасна, сэрцам.

Для таго каб зразумець, як узнікаюць вершы, звернемся да сведчанняў саміх пісьменнікаў. Вось як апісвае нараджэнне вершаў беларуская паэтка Ніна Мацяш: «Нараджэнню верша заўсёды папярэднічае нейкае несвядомае ўнутранае накапленне, а тады ўжо часта дастаткова літаральна дробязі — рэплікі, руху, промня на вадзе, начніцы ў святле вулічнага ліхтара — і раптоўна ўсярэдзіне нешта напята затрымціць, і густы, неўразумелы гул (яго прыблізна можна параўнаць з гулам нябачнага мора) уладна запаўняе ўсю істоту, зводзіць свядомасць да аднаго — да напружанага ўслухоўвання ў самога сябе, дзе з нейкіх нетраў да яе прабіваюцца першыя словы, музыка першых радкоў... Гэта немагчыма вытлумачыць!»

Алег Лойка сцвярджае, што паэтам можа быць кожны чалавек, але для гэтага трэба ў кожнай звычайнай рэчы бачыць незвычайнае.

Настаўнік чытае верш Алега Лойкі «Вечны запавет»:

Задзівіць серп маладзіковы
І клёна дальні сілуэт.
Душа, як тайны, прагне слова,
Бо кожны чалавек — паэт.

Бы вецер, абляцець гатовы
Зарэччы, пушчы — цэлы свет,
Душа, як волі, прагне слова,
Бо кожны чалавек — паэт.

Ззяць сонцам, бы штандар барвовы,
Між зораў, што вышэй ранет...
Душа, як славы, прагне слова,
Бо кожны чалавек — паэт.

Калі кахаць — не напалову,
Вітаць — і выраі, і квет...

Душа, як ласкі, прагне слова,
Бо кожны чалавек — паэт.

Дзе праца, плён, там і абновы,
І гэты вечны запавет:
Душа, як шчасця, прагне слова
Пераўтвараць на шчасце свет!

♦ Што, паводле верша А. Лойкі «Вечны запавет», можа быць закладзена ў слове?

♦ Дзеля чаго пішуцца вершы?

Алег Лойка паказвае нам, што ў слове, вершаваных радках можа быць прыхавана і тайна, і воля, і слава, і ласка, і шчасце. А ўсё гэта — дзеля пераўтварэння нашага жыцця на шчаслівае.

**Урок 2. Анатоль Вярцінскі «Дзівак чалавек»**

Вы ўжо знаёміліся з вершамі і раней, заўважылі, што яны бываюць на розныя тэмы.

♦ Якія вершы з раней вывучаных запомніліся, уразілі?

♦ Пра што яны? (Прачытайце на памяць.)

На якую б тэму ні былі напісаны вершы, усе яны адрасаваны чытачам, нам з вамі. Паслухайце, як беларускі пісьменнік С. Грахоўскі тлумачыць, для каго пішуца вершы: «Кожны ўсхваляваны паэтычны радок адрасуецца людскім сэрцам. Ён саграе і радуе іх, вымушае біцца часцей і суладней, на дабрату адказваць дабратой, на шчырасць — шчырасцю. Сапраўдная паэзія адкрывае свет, узвышае і акрыляе для смелых узлётаў, робіць нас чысцейшымі і дужэйшымі для надзённых велічных здзяйсненняў».

Пачаць размову пра таямніцу паэзіі прапануем з верша пра незвычайнага чалавека, які здольны здзіўляцца і верыць у дабро нават у самыя складаныя хвіліны свайго жыцця. Гэта верш А. Вярцінскага «Дзівак чалавек».

Аналіз верша можна правесці па пытаннях, прапанаваных у дапаможніку для вучняў, і дапоўніць іх наступнымі:

♦ Якімі сродкамі мастацкай выразнасці ствараецца вобраз «дзівака чалавека»?

♦ Чаму, на думку паэта, з умення здзіўляцца нараджаецца ўспрыманне паэзіі?

♦ Што дапамагае чалавеку быць і заставацца такім, якім яго бачыць паэт?

## Урок 3. Верш Максіма Танка «Паэзія»

***Мэта:*** дапамагчы вучням усвядоміць змест і сэнс параўнанняў і супастаўленняў паэзіі з рознымі з'явамі жыцця, паглыбляць веды пра разнастайнасць ідэйна-эстэтычнага пафасу паэтычных твораў, працягваць фарміраваць чытацкія якасці вучняў, неабходныя для паўнавартаснага ўспрымання лірыкі: эмацыянальную чуласць, вобразнае, асацыятыўнае мысленне, эстэтычную рэакцыю на мастацкае слова.

**Роля паэзіі ў жыцці чалавека.** Паэзія выконвае шэраг функцый:
1) эстэтычную (задавальняе патрэбу чалавека ў прыгожым, выклікае перажыванне, фарміруе густ і ідэал);
2) выхаваўчую (удзельнічае ў грамадска-палітычным і маральна-этычным выхаванні чалавека, дапамагае фарміраваць светапогляд);
3) пазнавальную (фіксуе найтанчэйшыя душэўныя зрухі);
4) камунікатыўную (наладжвае духоўны кантакт паміж паэтам і чытачом).

Паводле выказвання В. Традзіякоўскага, «тварэнне, домысел і перайманне ёсць душа паэзіі, але верш ёсць мова яе. Паэзія ёсць унутранае ў тых трох, а верш толькі вонкавае».

У класе настаўнік або папярэдне падрыхтаваны вучань чытае верш Максіма Танка «Паэзія». Пасля чытання абмяркоўваюцца пытанні:

♦ Якім настроем прасякнуты верш?

♦ Растлумачце сэнс паэтычных вобразаў — параўнанняў у творы;

♦ Выкажыце вашы адносіны да ідэі твора.

Загадка паэзіі звязана з таямніцай слова. Максім Танк у вершы «Паэзія» падбірае дакладныя, выразныя словы, якімі характарызуе сутнасць паэзіі. Словы ў мастацкім творы, вершы не заўсёды тоесныя словам паўсядзённай мовы. У літаратурным творы слова трапляе ў кантэкст, асаблівую сістэму слоў, дзе кожнае з іх не існуе адасоблена, а звязана з астатнімі мноствам граматычных, сінтаксічных, сэнсавых, стылістыч-

ных сувязяў. У паэтычным кантэксце слова набывае асаблівую выразнасць, становіцца ёмістым, сціслым, канцэнтраваным, шматзначным. Так утвараюцца тропы — словы, выразы ў пераносным, вобразным сэнсе. Рускі пісьменнік У. Салаухін сказаў: «Эпітэты — адзенне слоў». А С. Я. Маршак параўнаў паэта з чарадзеем.

Эстэтычная рэакцыя на яркае, вобразнае паэтычнаее слова — адна з якасцей развітага, «таленавітага» чытача. Таму пры аналізе вершаў трэба навучыць дзяцей вылучаць такія словы і задумвацца над іх шматзначнасцю:

♦ Чаму, на ваш погляд, паэт параўноўвае паэзію з бліскавіцай?

♦ Як і адкуль паэзія дапамагае вызваліцца?

♦ На якой падставе адбываецца яе параўнанне з кветкай і г. д.?

Неабходна яшчэ раз акцэнтаваць увагу вучняў на тым, што падзеі, якія адбываюцца вакол нас штодзённа, робяць на паэта моцнае ўражанне, выклікаюць у яго душы асаблівы водгук, усплёск пачуццяў. Таму ў вершах усё неяк перабольшана, узмоцнена. Паэт таму і можа аказаць на нас уздзеянне сваёй творчасцю, бо пачуцці, п844ражытыя намі, зведаў у шмат разоў мацней.

Галоўная асаблівасць лірыкі (паэзіі) заключаецца ў тым, што яна «засяроджана перш за ўсё на адлюстраванні ўнутранага свету чалавека», а гэта і адрознівае яе ад празаічных твораў. Паэзія перадае ўражанні, роздум, перажыванні, настроі, думкі і пачуцці, якія ўзніклі ў душы паэта пад уплывам жыццёвых абставін. Таму ў вершы М. Танка паэзія — і бліскавіца, і вызваленне, і чорствага хлеба скарынка.

Завяршыць работу над вершам М. Танка «Паэзія» варта выразным чытаннем. Апошняе чытанне верша на ўроку павінна быць асабліва яркім, запамінальным, каб у вучняў засталося ад яго цэласнае ўражанне.

## Урокі 4, 5. Алег Лойка «Радзіме», Сцяпан Гаўрусёў «Хлеб-соль»

***Мэта:*** пашыраць веды вучняў пра вершы патрыятычнай тэматыкі, выхоўваць пачуццё патрыятызму, любові да роднай зямлі.

Пачынаецца ўрок з уступнага слова настаўніка:

«Сёння мы з вамі пазнаёмімся з вершамі аб самым каштоўным — аб нашай Бацькаўшчыне. Чалавечая годнасць і вартасць нараджаецца з ведання гісторыі сваёй Радзімы і ўшанавання яе спадчыны.

У вершы А. Лойкі гучыць сыноўняе прызнанне ў любові да сваёй Айчыны, верш С. Гаўрусёва «Хлеб-соль» раскрывае такія рысы характару беларусаў, як гасціннасць, дабрыня, гордасць, таленавітасць».

Пры аналізе вершаў неабходна звярнуць увагу на арыгінальнасць у раскрыцці тэмы: звароты да народных прыказак, прымавак, дасціпных выслоўяў, выказванняў: «Лепш сто сяброў, чым сто рублёў», «корміць цвёрды дол» (верш «Хлеб-соль»); арыгінальная будова верша: роля пытальных сказаў: «А чым даўгі табе сплаціць, мая Радзіма?» (верш «Радзіме»). Асобна неабходна спыніцца на вершаваных памерах, якімі напісаны вершы, вызначыць колькасць радкоў у строфах і тое, як рыфмуюцца гэтыя радкі.

### Урок 6. Рыгор Барадулін «Матылёк»

***Мэта:*** пашырыць уяўленні вучняў аб загадкавай краіне Паэзіі за кошт увядзення ў іх чытацкую свядомасць верша Р. Барадуліна «Матылёк»; развіваць навыкі выразнага чытання; выхоўваць мастацкі густ, творчую самастойнасць дзяцей.

Верш «Матылёк» — пейзажны. Пісьменнік абраў да свайго верша эпіграф з твора М. Багдановіча «Маёвая песня». Безумоўна, яго ўразіў гэты верш і майстэрства паэта.

Настаўнік выразна чытае верш, засяродзіўшы ўвагу вучняў на сугучнасці слыхавых і зрокавых вобразаў.

Можна без цяжкасці ўявіць спякотны летні дзень («самлелы, абмялелы плёс»). Абмялелая ад гарачыні рака, цвітуць лілеі. На фоне блакітнага неба ляціць «віхлясты і бялявы» матылёк. Цёплыя ласкавыя хвалі лашчаць лінёў, у глыбіні паблісківаюць малькі.

Рыгор Барадулін вельмі ўдала выкарыстаў у вершы паўторы аднаго гука — [л]. Гукапіс надае вершу мяккае, лагоднае, закалыхваючае гучанне.

*Лілею*
млявы
плёс
люляе,
З-пад злежаных
аблок
здалёк
Ляціць віхлясты і бялявы
Пялёстак лёгкі —
матылёк.

Уся страфа насычана гукам [л]. Яе плаўнае і бясшумнае гучанне нагадвае рухі матылька ў паветры, плёскат хваль. Паводле выказвання М. Арочкі, у гэтым вершы Р. Барадулін «праверыў выяўленчыя магчымасці роднай мовы, яе гнуткасць, гукапіс, меладычнасць».

Завяршыць работу над вершам можна яго выразным чытаннем.

## V. Таямнічае ў звычайным і паўсядзённым *(12 гадзін)*

Назва раздзела арыентуе нас на тое, што літаратура, мастацкі твор праз звычайныя і паўсядзённыя з'явы адкрывае нам складаны свет чалавечых пачуццяў і адносін. Менавіта таму літаратуру называюць «чалавеказнаўствам». Эпіграфам да ўрокаў можна ўзяць словы П. Панчанкі:

Той дзень, лічы, завянуў пустацветам,
Калі ты пяць хвілін пашкадаваў,
Каб дзецям паказаць куточак свету,
І хараство людзей, і дрэў, і траў.

### Васіль Хомчанка «Звон пад зямлёй»

Апавяданне прасякнута непрыхаванай расчуленасцю аўтара душэўным хараством маленькага хлопчыка, які адкрывае для сябе прыгажосць свету і дарагіх яму людзей. Звычайныя,

паўсядзённыя рэчы ўбачаны вачамі шасцігадовага хлопчыка Васілька.

***Мэта:*** развіваць і ўдасканальваць уменні вучняў па рабоце з тэкстам: суадносіць апісанне часу і месца дзеяння з падзеямі твора; бачыць сувязь апісанняў прыроды з настроем і характарам чалавека; улічваць пры характарыстыцы героя апісанне яго знешняга выгляду; характарызаваць героя па ўчынках.

Спачатку вучні знаёмяцца са зместам твора, разбіваюць яго на часткі і даюць ім назвы. У тэксце выразна вылучаюцца тры часткі: 1) першае знаёмства з галоўнымі героямі твора; 2) падарожжа Васілька на гару; 3) пошукі хлопчыка і радасць сустрэчы.

Потым можна правесці гутарку па пытаннях, змешчаных пасля тэксту.

Наступны этап работы — назіранні над мастацкімі асаблівасцямі літаратурнага твора.

Каб работа з тэкстам захапіла ўсіх вучняў, варта падзяліць іх або прапанаваць вучням самім падзяліцца на дзве творчыя групы.

Групы атрымліваюць заданні:

— знайсці і прачытаць апісанні знешняга выгляду герояў (бабулі, хлопчыка Антона, дзядзькі);
— знайсці апісанні пары года, калі адбываецца дзеянне.

Настаўніку неабходна акцэнтаваць увагу на тым, што апісанне знешняга выгляду герояў часцей не даецца ў адным месцы, а асобныя яго дэталі-штрыхі як бы раскіданы па ўсім тэксце. Таму вучні павінны быць уважлівымі да кожнай мастацкай дэталі, бо кожная з іх дапамагае нам не толькі ўявіць зрокава герояў, але і раскрыць характар, зразумець пачуцці і перажыванні.

Пейзаж таксама мае важнае значэнне, бо дзякуючы яму не толькі расказваецца пра месца дзеяння, але і выяўляюцца адносіны героя альбо аўтара твора да жыцця, да сваёй зямлі.

Апісанне бабы Настачкі:

«Вочы ў бабы маленькія, вузенькія, вакол іх, нібы павуцінне, зморшчынкі, а старкаваты твар шэры, выцвілы, як пустое поле ў познюю восень»;

«Баба Настачка, сагнуўшыся, ішла па баразне, ірвала свінням траву і складвала ў фартух. Паўзучая бярозка, учэпіста аб-

круціўшы бульбоўнік, цяжка паддавалася яе рукам і адрывалася з трэскам. Аднак сухаватыя, загарэлыя бабіны рукі даволі шустра мільгалі ў бульбоўніку. Калі фартух набіваўся, бабка выпрамлялася і размінала дзвюма рукамі паясніцу. Твар яе ад таго, што падоўгу не разгіналася, быў чырвоны. Адпачыўшы трохі і размяўшы паясніцу, яна ішла на мяжу і складвала траву ў мех. Баба нават не заваўжыла, што з'ехала хустка з галавы і агаліла сівыя, нібы мукой абсыпаныя, валасы. Андарак на бабе доўгі, да самых забарсней, бурачнага колеру, з шырокім падалом, аблямаваным зялёнымі і чорнымі паскамі. А кофта белая, падраная на локцях»;

«Баба напхала поўны мех травы, вынесла яго на сцежку і прысела на гэты мех. Стомленыя рукі ляжалі на каленях, прыжмураныя вочы глядзелі ў зямлю».

Апісанне пары года, калі адбываецца дзеянне:

«Сухі ліпень затапіў зямлю гарачынёй, спякотным сонечным святлом, парнай цішынёй, высініў неба, сцёршы з яго ўсе хмурынкі і аблачынкі, і яно апусцілася нізка, нібыта хацела параўнаць сваю сінюю красу з красой зямной, зялёнай. Чорныя кропкі ластавак прашывалі сінечу неба, і чым гарачэй рабілася на зямлі, тым вышэй і вышэй узнімаліся ластаўкі»;

«Пуста ў вёсцы і ціха. Хто на сенажаці, хто ў лесе, хто на рэчцы. Не чуваць нічыйго крыку, піску, смеху.

Бульбяное поле густа цвіло белымі і сінімі кветкамі, якія пілі сонца і шчодра дзяліліся сваім сокам з усёй жыўнасцю, што кішэла на іх. Ад бульбы ішоў здаровы цёплы пах зямлі», — і далей.

Пасля зачытвання апісанняў настаўнік засяродзіць увагу вучняў на тым, як па-майстэрску пісьменнік выкарыстоўвае сродкі мастацкай выразнасці — эпітэты, параўнанні, памяншальна-ласкальныя словы, метафары.

Малюючы партрэт бабы Настачкі, пісьменнік болей карыстаўся эпітэтамі і параўнаннямі: «стракаваты твар шэры, выцвілы, як пустое поле ў познюю восень», «сівыя, нібы мукой абсыпаныя, валасы».

Гэта апісанне гераіні дапамагае нам зразумець і яе характар: перад намі старая, змораная за жыццё жанчына. Яна звыклая да цяжкай працы, рукі яе і зараз даволі шустра мільгалюць ў

бульбоўніку. Яна не прыслухоўваецца да сваіх хвароб, нікому не скардзіцца, а працуе, як працавала ўсё сваё жыццё.

У пейзажнай замалёўцы пісьменнік выразна перадаў спякоту лета, душную млоснасць ліпеньскага дня праз апісанне красы зямлі і неба і амаль нерухомага стану дамашніх жывёл.

Васіль Хомчанка адухаўляе прыроду: «кветкамі, якія пілі сонца і шчодра дзяліліся сваім сокам з усёй жыўнасцю», «Сухі ліпень затапіў зямлю гарачынёй…, высініў неба, сцёршы з яго ўсе хмурынкі… і яно апусцілася нізка, нібыта хацела параўнаць сваю сінюю красу з красой зямной, зялёнай», «Дарозе было горача, і яна падціскалася сваімі краямі ў цень».

Аўтар з замілаваннем апісвае прыроду, ёмка падбірае словы, каб паказаць прыгажосць роднай зямлі. Васілёк бачыць «велізарны і неабдымны свет» Беларусі з бульбяным полем, якое «густа цвіло белымі і сінімі кветкамі», дарогай, што «вузкая травяная стужка з тупкімі каляінамі — вілася па полю ўлева-ўправа, рассоўваючы ў бакі то палосы бульбы, то жыта», і інш.

Неабходна звярнуць увагу на тое, што аўтар не дае дакладнага апісання хлопчыка Васілька, але настолькі падрабязна апісвае яго пачуцці, учынкі, уражанні, што мы лёгка можам уявіць шасцігадовага хлопчыка («ці ж цяжка яму несці на плячах свае шэсць гадоў»), які вельмі адкрыты, даверлівы, добры, спачувае людзям і прыродзе, цікаўны, дапытлівы.

Пісьменнік супрацьпастаўляе вобразу Васількі хлопчыка Антона. Яго прыход уносіць адчувальную перамену ў застылую спякоту лета. У вёсцы хлопчыка за ўчынкі і складаны характар празвалі Цыганам. Мы не бачылі ў апісаннях аўтара нейкіх зусім адмоўных характарыстык Антона, але ўсё ж такі атрымалася ўражанне, што ён манюка і «жартаўнік», любіць «пашчыпаць» малодшых дзяцей, выгадаць для сябе што-небудзь.

Пісьменнік паказвае нам звычайнага вясковага мужчыну, які падвёз Васілька да гары і расказаў старое паданне пра звон пад зямлёй. Васіль Хомчанка дэталёва апісвае знешнасць дзядзькі, мясцовасць каля гары. Такіх дэталёвых апісанняў вельмі многа ў творы. Яны нараджаюць зрокавыя і слыхавыя асацыяцыі, дазваляюць успомніць нейкія падобныя моманты са свайго ўласнага жыцця.

Наступныя заданні будуць звязаны з выпрацоўкай у вучняў умення выразнага чытання і творчага пераказу асобных урыўкаў. Вучням прапануцца выразна прачытаць урывак, дзе апісваецца даўняя гісторыя-паданне пра тое, як схавала зямля пад сабою прыгожую царкву з людзьмі і званамі, бо яно пакідае глыбокі след у чытача, ад слоў:

«— Даўняя гэта гісторыя, мой хлопчык, — ён паклаў руку на галаву Васілька, задумаўся, а потым, як бы гаворачы сам з сабою, працягваў: — Даўным-даўно, калі не было на свеце ні тваёй бабы, ні яе дзеда, ні дзедавага дзеда, жылі на гэтай гары людзі. Гара была тады і шырэй, і вышэй, акружаў яе вал земляны і дубовая сцяна. На самай вяршыні гары стаяла белая цэркаўка з сярэбранымі званамі і залатымі крыжамі. Званы так прыгожа звінелі, што ўсё жывое і нежывое замірала, слухаючы іх».

Пасля гэтага вучні перакажуць эпізод, у якім расказваецца, як хлопчык спрабаваў адкапаць людзей, яго імкненні дапамагчы жыхарам старога горада.

Аўтар твора паказаў цёплыя ўзаемаадносіны Васілька і бабулі. Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на тое, што бабуля паважае свайго маленькага ўнука, не сварыцца на яго, хаця вельмі перахвалявалася, пакуль знайшла яго на гары, не збіраецца даводзіць хлопчыку, што на самай справе марныя яго турботы і клопат аб вызваленні жыхароў засыпанага горада. У бабулі вялікі жыццёвы вопыт, мудрасць, таму яна не парушае паэтычнай узнёсласці хлопчыка, яго веры ў дабро, справядлівасць, узаемадапамогу.

Васілёк таксама стараецца не пакрыўдзіць бабулю, ведае, што яна за яго перажывае (прыгадайце эпізоды, дзе хлопчык гладзіць бабулю, калі яна засынала на полі, і інш.) І тое, што малы выпадкова адбіўся ад бабулі, каб паслухаць звон пад Гарадзішчанскай гарой, а потым адшукаўся, успрымаюцца намі як звычайныя дзіцячыя прыгоды. Хлопчык назірае за прыродай, па-дзіцячы разважае над тым, што такое старасць (роздум Васілька аб старой вярбе і бабулі).

Заканчваецца твор на ўзнёслай ноце гармоніі ўзаемаадносін паміж людзьмі: «Шчасцем родства, любоўю да блізкіх была напоўнена і бабіна душа. Вось на руках той жывы атожылак, які прарос з яе плоці, сын яе сына, здаравенькі, душэўны і чысты,

як крынічка, хлопчык. Ён працягне род яе, застанецца жыць і тады, калі яна будзе ўжо нішто, пыл, прах...

І баба Настачка ўспомніла старую вярбу, ад каранёў якой цягнуліся к жыццю радасныя гонкія парасткі».

Напрыканцы заняткаў настаўнік можа прапанаваць вучням паразважаць над выказваннямі беларускіх пісьменнікаў пра дзяцінства, выхаванне:

«У маленстве мы спазнаём свет, каб прыняць яго такім, які ён ёсць, каб ведаць, што ён ёсць» (*У. Рубанаў*);

«Гадуюцца дзеці ў любові — ратуецца вечнасць» (*Л. Рублеўская*);

«Самае складанае ганчарства — гэта ляпіць чалавека» (*А. Бадак*).

**Якуб Колас «Дзеравеншчына»**

У невялікім па памеры творы Якуб Колас узнімае вельмі важнае пытанне: «Што значыць быць “чужым” сярод “сваіх”?» Настаўніку варта засяродзіць увагу вучняў на тым, што кожны мастацкі твор мае на мэце з дапамогай вобразаў, сюжэта вырашыць выхаваўчыя задачы — задумацца над тым, як мы ставімся да блізкіх нам людзей, ці заўсёды паводзім сябе ў адпаведнасці з маральнымі прынцыпамі, ці здольны зразумець іншых.

***Мэта:*** узбагаціць веды вучняў пра Якуба Коласа, які выступаў у літаратуры не толькі як аўтар вершаваных твораў, але і як празаік; разіваць звязную мову вучняў; выпрацоўваць навыкі выразнага чытання празаічнага твора; выхоўваць пачуццё спагады ў адносінах да іншых людзей; навучыць дзяцей на матэрыяле апавядання «Дзеравеншчына» характарызаваць героя, параўноўваць яго з героем апавядання Г. Сянкевіча «Янка-музыка»); дапамагчы вучням адчуць глыбокі псіхалагізм у выяўленні аўтарам характару Міхалкі, яго перажыванняў і пачуццяў; выпрацоўваць уменне аналізаваць мастацкі твор; паказаць ролю пейзажу ў перадачы перажыванняў героя; развіваць творчыя здольнасці вучняў.

Пачаць абмеркаванне апавядання можна з уступнага слова настаўніка пра жыццё і творчасць Якуба Коласа. З творамі пісьменніка дзеці ўжо знаёміліся ў пачатковай школе, а таксама ў 5-м і 6-м класах на ўроках беларускай літаратуры. Таму вучні без

цяжкасцей прыгадаюць герояў з апавяданняў Якуба Коласа, назавуць вершы, апавяданні, якія прачыталі самастойна («Крыніца», «Песняляснога жаваранка», урыўкі з паэмы «Новая зямля», апавядання «У старых дубах», казкі «Жывая вада», «Не дай божа сэрцам знікнуць», байку «Конь і сабака», верш «Ручэй»).

Каб вучні больш даведаліся пра маленства пісьменніка, яго творчасць, прынялі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да занятка, варта прапанаваць апераджальныя заданні. У прыватнасці, падрыхтаваць паведамленні або выразнае чытанне ўспамінаў братоў і сёстраў Якуба Коласа па кнігах «У сэрцы народным» (Мінск, 1967), М. Лужаніна «Колас расказвае пра сябе» (Мінск, 1964) і інш. Наглядны матэрыял таксама дапаможа зрабіць заняткі цікавымі і запамінальнымі, папоўніць веды вучняў пра пісьменніка. Падагульненнем пачутага і абмеркаванага на занятках можа быць невялікая віктарына:

1. Чаму Якуб Колас абраў сабе такі псеўданім?
2. У якім творы пісьменнік расказаў пра сваё маленства? Прыгадайце ўрыўкі, з якіх вы даведаліся пра родных і сваякоў Якуба Коласа;
3. Назавіце герояў апавядання «У старых дубах».
4. З якімі вершамі пісьменніка вы пазнаёміліся самастойна?
5. Якую байку Якуба Коласа вы вывучалі ў 6-м класе?
6. У якім творы Жывая вада перамагла Гару?

Пасля адказаў вучняў варта зазначыць, што ў спадчыне Якуба Коласа ёсць шмат вершаваных і празаічных твораў. У іх памастацку асэнсоўваюцца чалавечы лёс, грамадскае жыццё, родная прырода.

Наступны этап — выразнае чытанне апавядання Якуба Коласа «Дзеравеншчына». Спачатку настаўнік дае ўзор выразнага чытання, а потым чатанне працягваюць вучні. Пасля гэтага варта апытаць клас:

- Якія пачуцці выклікала апавяданне?
- Якое ўражанне зрабіла яно на вас?
- Які эпізод з апавядання запомніўся?
- Хто з герояў апавядання спадабаўся, а хто не?
- Што хацеў сказаць Якуб Колас сваім чытачам?

У сваім падагульненні настаўнік скажа, што апавяданне «Дзеравеншчына» — гэта твор пра душэўныя пакуты галоўнага героя

Міхалкі, якому цяжка жывецца ў нязвыклых для яго гарадскіх умовах і ў сям'і, па-сутнасці, абыякавай да яго і яго лёсу.

Вучні ўжо ведаюць змест апавядання, падрыхтавалі яго падрабязны пераказ. Настаўнік прапануе вучням зачытаць варыянты сваіх планаў, а потым пераказаць апавяданне.

Прыкладны план:

1. Думкі Міхалкі.
2. Куток — роднае для хлопчыка месца.
3. Пакуты Міхалкі ў горадзе.
4. Выбіванне «дзеравеншчыны».
5. Прырода ў жыцці Міхалкі.
6. Успаміны хлопчыка.
7. Задума Міхалкі.
8. Няўдалыя ўцёкі.
9. Якое жыццё чакае Міхалку наперадзе?

Далей настаўнік скажа, што Міхалка — галоўны герой апавядання. Якуб Колас у сваім творы паказвае, як цяжка жывецца маленькаму хлопчыку ў братавай сям'і. Потым настаўнік прапануе абмеркаваць пытанні, якія дапамогуць ахарактарызаваць галоўнага героя і высветліць, чаму так адбылося.

Пытанні для абмеркавання:

- ♦ Якім вы ўяўляеце Міхалку?
- ♦ Як ставіцца да свайго героя Якуб Колас?
- ♦ Што вы даведаліся пра родзічаў Міхалкі?
- ♦ Чаму Міхалка апынуўся ў горадзе, у сям'і брата?
- ♦ Як аўтар паказвае адносіны родзічаў да Міхалкі?
- ♦ Чаму Міхалка часта ўспамінае родную вёску?
- ♦ Як хлопчык ставіцца да няшчасцяў, што выпалі на яго долю?
- ♦ З якімі героямі, падобнымі да Міхалкі, вы сустрэліся ў раней прачытаных творах?

Пры абмеркаванні пытанняў настаўнік прапануе вучням пацвердзіць свае думкі цытатамі з тэксту.

Аўтар не дае апісання знешнасці хлопчыка. А пра характар Міхалкі мы даведваемся праз яго ўчынкі і разважанні, багаты ўнутраны свет.

Міхалка — зусім малы хлопчык, сірата. Бацькі яго памерлі, і таму ён апынуўся ў горадзе, у братавай сям'і. Якуб Колас

спачувае свайму герою. Ён называе Міхалку «малы», падбірае ацэначныя словы, каб апісаць стан і дзеянні хлопчыка. Ад сваіх родных Міхалка не чуе добрых слоў, для іх ён «свінюк», «шыбельнік», «дзеравеншчына». Хлопчык ужо і не крыўдзіцца на іх. Ён прывык да зняваг. Міхалка разумее, што абараніць яго няма каму, таму пакорліва зносіць усе пакуты. Самае роднае месца ў хаце для хлопчыка — куток. Як зазначае аўтар: «Ды яно і не дзіва: тое месца, дзе ронім мы першыя слёзы і пакідаем частку сябе саміх, становіцца дарагое для нас. А ў гэтым кутку Міхалка многа чаго перадумаў. І адзін толькі ён, гэты куток, знаў усе яго думкі, бо пагаварыць тут няма з кім». Але ў хлопчыка багатае ўнутранае жыццё.

♦ Якім паказвае свайго героя Якуб Колас у рэальным і выдуманым свеце?

У рэальным жыцці хлопчыку вельмі цяжка. Горад для яго чужы. Брат і ягоная сям’я таксама чужыя. Ён усё робіць не так, як ад яго патрабуюць і чакаюць брат і ягоная жонка. За гэта хлопчыка караюць. Ён па некалькі разоў на дзень стаіць у кутку на каленях за тое, што «не знае гарадскіх парадкаў і кепска трымае сябе». Міхалка разумеў, што ягоныя няшчасці ніколі не скончацца: «То скажаш не так, то ступіш не гэтак, і за ўсё пападала то вушам, то каленям».

Міхалка знайшоў выйсце — прыдумаў свой свет, у які можна схавацца ў цяжкія хвіліны. Гэты свет зусім іншы. Тут добра і лёгка. У гэтыя хвіліны ён нічога не думае. Ён толькі чуе, як прыемнае цяпло песціць яго маленькае цельца. І добра так, і радасна на сэрцы. «А што робіцца на душы, то гэтага і не скажаш».

♦ Як хлопчык ставіцца да прыроды?

Якуб Колас дае ў сваім творы апісанні прыроды. Яны дапамагаюць адчуць і ўбачыць багаты ўнутраны свет хлопчыка. Міхалка любіць прыроду. Для яго сабака — «такі самы бяздомнік у горадзе», якога трэба пакарміць, з якім можна «адвесці душу».

Міхалка разумее прыроду, адчувае да яе замілаванне: «...сіняе неба ласкава звесіцца над зямлёю, як маці над калыскаю, дзе ляжыць яе любае дзіцятка. А гэтыя хмурынкі! Хто іх ведае, адкуль яны выпаўзаюць і куды ідуць так згодненька, такія мілыя ды прыветныя».

Прырода з'яўляецца часткай выдуманага свету хлопчыка, дзе пануе чысціня, прыгажосць, дабрыня: «У садку шчабечуць птушкі. Верабейчыкі з вясёлым чырыканнем снуюць у паветры».

Прырода — напамін пра вольнае і шчаслівае жыццё ў вёсцы: «Ах, як там добра ў вёсцы!.. Вось высокі касагор над самым Нёманам. Пад гэтым касагорам стаяць над вадою нахіленыя старыя вербы, там калісь так многа было ракаў. Там ляжыць зялёны луг, а за лугам цягнецца высокі і заўсёды пануры лес...»

♦ Чаму Міхалка вырашыў уцячы з горада?

Міхалка верыў, што, як толькі ён пакіне горад, вернецца яго шчаслівае і вольнае жыццё. Хлопчык апынуўся ў сям'і брата па волі лёсу — памерлі ягоныя бацькі. Міхалку забралі ў горад, бо ён нікому не патрэбны. Хлопчык не патрэбны і брату, але ж родны чалавек, яго не выкінеш. Таму Міхалка ў сям'і брата і адчувае сябе так няёмка. Яго супрацьпастаўляюць роднай дачцэ Лідачцы, якую любяць, купляюць розныя цацкі, а Міхалка павінен даглядаць яе, забаўляць.

Хлопчык вырашыў збегчы з сям'і брата, «задумаў такую рэч, што ўсе дзівіцца будуць».

Міхалка памятае пра сваіх сяброў у вёсцы, каб не ісці з пустымі рукамі, ён збірае для іх падарункі: «мячык і чалавека з гумалястыкі, у якога трэба было толькі дзьмухнуць, каб ён загукаў, як жывы».

Наступнае заданне будзе звязана з апавяданнем, якое вучні прачыталі раней, — Г. Сянкевіча «Янка-музыка». Настаўнік прапануе вучням успомніць галоўных герояў гэтых твораў Міхаську і Янку-музыку і падумаць над пытаннямі:

♦ Што агульнае было ў лёсах галоўных герояў?

♦ Чым хлопчыкі адрозніваліся ад іншых людзей?

Янка з апавядання Г. Сянкевіча «Янка-музыка» таксама не быў зразуметы дарослымі: «Маці яго, бедная падзёншчыца, перакідалася з дня на дзень, нібы ластаўка пад чужой страхой. Можа, яна і любіла яго па-свойму, але лупцавала часта, абзываючы зазвычай чарцянём».

Дарослыя не разумелі ні Міхалку, ні Янку, не маглі прыняць іх цягу да прыроды, усяго прыгожага. Іхняе незвычайнае светаўспрыманне раздражняла, лічылася нейкай хваробай, адхіленнем ад нормы.

Наступныя пытанні заклікаюць вучняў да дыскусіі, у якой яны змогуць выказаць свае меркаванні наконт таго, як складзецца лёс Міхалкі з апавядання Якуба Коласа «Дзеравеншчына».

♦ Ці добра, што ўцёкі Міхалкі не ўдаліся?

♦ Як, на вашу думку, складзецца лёс хлопчыка далей?

На першы погляд можна лічыць, што дрэнна. Міхалка марыў уцячы, лічыў, што зменіцца ягонае жыццё. І ў той жа час мы не ведаем, ці ўдалося б хлопчыку дабрацца да вёскі. У дарозе яго таксама маглі чакаць розныя неспадзяваныя падзеі, злыя людзі і г. д.

Для Міхалкавага брата гэта своеасаблівы «шанс», магчымасць змяніць свае адносіны да хлопчыка. Можа, ён усё ж такі зразумее брата і ягоную «дзеравеншчыну», памятаючы пра сваё ўласнае паходжанне, пра бацькоў.

♦ Чаму апавяданне называецца «Дзеравеншчына»? Настаўнік зверне ўвагу вучняў на тое, што слова ўзята ў двукоссе. Яно ацэначнае. Вучні прыгадаюць, што часцей за ўсё яно гучыць з вуснаў Міхалкавых сваякоў. Сам хлопчык тлумачыць яго так: «...Не знаю гарадскіх парадкаў і кепска трымаю сябе...» Аўтар асуджае сваякоў Міхалкі, бо яны вінаватыя ў тым, што хлопчык адчувае сябе чужым, «дзеравеншчынай», усяго баіцца.

У падагульненні настаўнік падвядзе вучняў да высноў: Якуб Колас у апавяданні «Дзеравеншчына» звярнуўся да праблемы ўзаемаадносін людзей. Вельмі часта крыўднае слова, нежаданне зразумець іншага чалавека наносяць удар па ягонай душы, знішчаюць індывідуальнасць. Карыстаючыся прыёмам псіхалагізму, Якуб Колас паказвае перажыванні героя, яго думкі, душу. Мы перажываем за Міхалку, спачуваем яму, шкадуем. Літаратурны твор дапамагае нам задумацца над многімі пытаннямі, каб потым не паўтарыць памылкі герояў у сваім жыцці і ва ўзаемаадносінах з людзьмі.

### Янка Маўр «Палескія рабінзоны»

***Мэта:*** працягваць знаёміць вучняў з жанравымі асаблівасцямі прыгодніцкіх твораў; зацікавіць іх аповесцю і прыгодамі галоўных герояў — Віктара і Мірона; паказаць кантраст паміж марай герояў і рэальнай небяспекай; выхоўваць цікавасць да пазнання таямніц свету.

Аповесць Янкі Маўра «Палескія рабінзоны» чытаецца вучнямі з вялікай цікавасцю, хоць і была напісана яшчэ ў 1930 годзе. У гэтым вострасюжэтным творы, у якім шмат драматычных сітуацый, цікавых здарэнняў, гумару, сённяшнія падлеткі адкрываюць для сябе беларускае Палессе. Янка Маўр па-мастацку пераконвае дзяцей, што ў нас ёсць нямала прыгожых і дзівосных куткоў, не горшых, чым у іншых краінах свету.

У дапаможніку для вучняў аповесць «Палескія рабінзоны» падаецца ў скарачэнні. Будзе добра, калі настаўнік загадзя папярэдзіць вучняў, каб яны прачыталі твор цалкам.

Зацікавіць вучняў асобай пісьменніка, пазнаёміць іх з асаблівасцю яго творчасці дапамогуць выказванні пра Янку Маўра, яго творчасць. Напрыклад:

«Я належу да таго пакалення людзей, чыё дзяцінства кнігі Янкі Маўра поўнілі шчаслівым жыватворчым захапленнем ад нечаканых адкрыццяў і пазнання незнаёмага дзівоснага свету. Божа мой, ты чытаў, ты забываў ўсё на свеце...» (*А. Васілевіч*);

«Гэта арыгінальны і багаты па сваіх творчых здольнасцях, па сваёй універсальнай эрудыцыі пісьменнік» (*А. Якімовіч*);

«Ён — нязменны капітан на караблі нашай дзіцячай літаратуры. І кожны з нас можа пацвердзіць: Маўравы творы вытрымалі выпрабаванне вятрамі і штормамі часу» (*У. Ягоўдзік*).

Янка Маўр — таленавіты дзіцячы пісьменнік, які далучыў беларускую літаратуру да лепшых традыцый сусветнай прыгодніцкай літаратуры, прадстаўленай найперш творамі М. Рыда, Ф. Купера, Ж. Верна, Дж. Лондана.

У сваіх творах пісьменнік расказаў пра Інданезію, Італію, Вогненную Зямлю, Кітай, Новую Гвінею, Цэйлон, паказаў побыт і звычаі народаў, якія жывуць там, дэталёва апісаў прыроду гэтых экзатычных мясцін.

У далёкім 1926 годзе часопіс «Беларускі піянер» пачаў друкаваць аповесць «Чалавек ідзе». Гэта былі замалёўкі з жыцця першабытных людзей. Аўтар аповесці — Іван Міхайлавіч Фёдараў, настаўнік гісторыі і геаграфіі, які абраў сабе такі цікавы псеўданім — Янка Маўр.

Пісьменнік нібы інтрыгаваў свайго маленькага чытача: адгадайце, хто хаваецца за незнаёмым іншаземным Маўрам? *Маўр* у перакладзе з грэчаскай мовы азначае цёмны; так часта называлі людзей афрыканскага паходжання. Пісьменнік выступаў нібы сапраўдны паўнамоцны прадстаўнік шматпакутных абарыгенаў Афрыкі. Янка Маўр настолькі добра і дэталёва апісваў жыццё і побыт фуіджынцаў, папуасаў, яванцаў — жыхароў іншаземных краін, што чытачы ўяўлялі яго суайчыннікам гэтых народаў. Між тым Янка Маўр ніколі не быў у краінах, пра якія расказваў у сваіх кнігах, ён толькі марыў аб падарожжы вакол свету. Цікавую інфармацыю пісьменнік браў з розных часопісаў, кніг, а таксама з перапіскі з эсперантыстамі розных краін свету.

У 1930 годзе з'яўляецца новы твор Янкі Маўра — аповесць «Палескія рабінзоны». У ім таксама пераважаюць матывы прыгод, падарожжаў, але на гэты раз пісьменнік хоча зацікавіць сваіх чытачоў роднай зямлёй, яе прыродай, не менш таямнічай, чым прырода экзатычных заморскіх краін.

Янка Маўр паказаў, што і пад небам Беларусі ёсць свая, не заўважаная яшчэ рамантыка: «Ёсць пушчы, не менш цікавыя, чымся далёкія трапічныя лясы. Ёсць азёры і балоты, якія ўвесну робяцца морамі. Ёсць звяры, якія радзей сустракаюцца на свеце, чым сланы і тыгры».

Цяпер настаўніку варта скіраваць увагу на тое, каб выявіць, як вучні ведаюць змест аповесці «Палескія рабінзоны». З гэтай мэтай можна звярнуцца да віктарыны, якая дапаможа высветліць непасрэдныя чытацкія ўражанні ад аповесці. Вось адзін з магчымых варыянтаў віктарыны:

1. Як звалі галоўных герояў аповесці «Палескія рабінзоны»? (Мірон Бажко і Віктар Каляга);

2. Чаму хлопцы вырашылі адправіцца ў незвычайнае падарожжа? (У час вясновых канікул пад уражаннем ад кніг аб далёкіх заморскіх краінах, ад прыгод, апісаных Ж. Вернам, М. Рыдам);

3. Колькі часу студэнты тэхнікума правялі на бязлюдным востраве? (Месяц);

4. Што дапамагло хлопцам выжыць на востраве? (Вопыт, назапашаны папярэднім развіццём чалавецтва, і ўласныя рукі);

5. З якімі людзьмі Мірон і Віктар сустрэліся на востраве? (З бандытамі-кантрабандыстамі);

6. Каго з герояў апісвае Янка Маўр: «...худы, цыбаты дзяцюк, з блакітнымі вачыма, доўгім птушыным носам і доўгімі светлымі валасамі»? (Мірон);

7. Пра каго пісьменнік гаворыць: «прысадзісты, карчасты, чарнявы, з круглым пляскатым тварам»? (Віктар);

♦ Што пісьменнік расказаў пра Мірона і Віктара?

У цэнтры аповесці — два героі, гарадскія хлопцы Мірон Бажко і Віктар Каляга, студэнты тэхнікума. У час вясновых канікул юнакі захацелі пабачыць славутае палескае разводдзе. Пад уражаннем ад кніг аб далёкіх заморскіх краінах, ад прыгод, апісаных Ж. Вернам, М. Рыдам, Ф. Куперам, Мірон і Віктар на «душагубцы» выпраўляюцца ў незвычайнае падарожжа. Становішча, у якое трапляюць Мірон і Віктар вельмі нагадвае «падарожжа» героя кнігі Д. Дэфо Рабінзона Круза. Толькі хлопцы пражылі на востраве не 28 гадоў, а ўсяго месяц.

♦ Якога ўзросту былі хлопцы?

Настаўнік прапаноўвае знайсці ў тэксце месца, дзе апісваецца ўзрост хлопцаў, і зачытаць яго (I раздзел): «Яны былі аднагодкі і мелі абодва разам гадоў трыццаць пяць».

♦ Ці падобныя былі Мірон і Віктар па характары?

Вучні адзначаць, што характары ў хлопцаў былі зусім розныя. Мірон — разважлівы, спакойны хлопец, а Віктар, наадварот, жвавы, імклівы. Але гэта не перашкаджала іх сяброўству, яны былі найлепшымі сябрамі і жыць не маглі адзін без аднаго.

♦ Як хлопцы пазнаёміліся?

Яны былі суседзямі, сябравалі іх бацькі.

♦ Чым цікавіліся Мірон і Віктар?

Хлопцы добра вучыліся, чыталі шмат розных кніжак пра прыгоды і падарожжы. Яны былі гарадскімі жыхарамі, вельмі рэдка выязджалі з горада, таму, каб болей даведацца пра прыроду свайго краю, наведвалі краязнаўчы гурток.

♦ Якім прадметам у школе, гуртку хлопцы аддавалі больш увагі?

Мірон цікавіўся больш батанікай, у жывым кутку ён вывучаў розныя расліны, а Віктар — заалогіяй і знаёміўся з жыццём трусоў, мышэй, жаб.

♦ Чаму Мірон і Віктар вырашылі самастойна адправіцца ў падарожжа? Зачытайце гэтыя месцы (I раздзел).

«У краязнаўчым гуртку яны даведаліся, што на Беларусі наогул, а ў іх раёне асабліва, ёсць шмат куткоў, не горшых ад заморскіх. Ёсць пушчы, не менш цікавыя, чымся далёкія трапічныя лясы. Ёсць азёры і балоты, якія ўвесну робяцца морамі. Ёсць звяры, якія радзей сустракаюцца на свеце, чым сланы і тыгры».

♦ Чым абярнулася самастойнасць і самаўпэўненасць хлопцаў?

♦ Перакажыце эпізод, у якім гаворыцца пра першае паляванне Мірона і Віктара.

♦ Якія ўменні хлопцы набылі на востраве?

♦ Што прыйшлося ім рабіць, каб выжыць?

♦ Як Мірон і Віктар ставіліся да сваіх памылак?

♦ З дапамогай чаго пісьменніку ўдалося паказаць кантраст паміж марай герояў пра незвычайныя падарожжы і сустрэчай з рэальнай небяспекай?

Вучні прыгадваюць дыялогі Мірона і Віктара, якія дапамагаюць адчуць напружанне, трывогу, пошукі выхаду са складаных сітуацый.

Падагульненнем пачутага на ўроку могуць быць высновы: Мірон і Віктар марылі пра падарожжы і прыгоды, але іх самаўпэўнены ўчынак (паехалі, не папярэдзіўшы дарослых, гаспадара лодкі) мог прывесці да бяды. Ім спатрэбілася прыкласці шмат намаганняў, каб выжыць на востраве і не страціць веру ў сябе. Хлопцы павінны былі ўспомніць усё тое, што яны ведалі пра раслінны і жывёльны свет Беларусі, а дапамаглі ім у гэтым заняткі ў краязнаўчым гуртку. Бадай самым галоўным, што дапамагло Мірону і Віктару выжыць, было іх сяброўства. Яны шукалі выхаду са складаных абставін разам, не абвінавачваючы адзін аднаго ў промахах і памылках.

♦ Што аб'ядноўвае хлопцаў?

Героі Янкі Маўра маюць шмат агульнага, але разам з тым яны паўстаюць рознымі, у сваёй індывідуальнай адметнасці. Аўтар стараецца паказаць псіхалагічны стан герояў. Адным з адрозненняў з'яўляецца кола інтарэсаў хлопцаў: Віктар цікавіцца больш заалогіяй, а Мірон — батанікай. У іх розныя характары,

але аб'ядноўвае, узмацняе паразуменне сапраўды высакародная дружба юнакоў. Тое, што адзін занадта гарачы, уражлівы, імпульсіўны, з хуткай зменлівасцю настрою («наколькі хутка і моцна выбухала ў ім энергія, настолькі хутка яна і знікала»), а другі — больш спакойны, цярплівы, разважлівы, стварае ў аповесці атмасферу звычайных жыццёвых узаемаадносін, з гарачымі спрэчкамі, дасціпнымі дыялогамі, гумарам, з хлапечым жаданнем упікнуць адзін аднаго.

Каб раскрыць вобразы Мірона і Віктара, паказаць іх жыццястойкасць, веру ў свае сілы і здольнасць знайсці выйсце ў любой складанай сітуацыі і каб вучням было лягчэй характарызаваць герояў твора, настаўнік можа прапанаваць план характарыстыкі мастацкага вобраза-персанажа:

*Уступ.* Месца героя ў сістэме вобразаў твора.

*Галоўная частка.* Характарыстыка героя.

1. Сацыяльнае становішча (вучань, студэнт і г. д.).
2. Знешні воблік.
3. Кола інтарэсаў, схільнасцей і звычак:
   а) характар дзейнасці, жыццёвыя погляды;
   б) уплыў на тых, хто акружае.
4. Сфера пачуццяў (узаемаадносіны з іншымі героямі, унутраныя перажыванні).
5. Аўтарскія адносіны да персанажа.
6. Якія рысы асобы героя выяўляюцца ў творы:
   а) з дапамогай партрэта;
   б) у аўтарскай характарыстыцы;
   в) праз характарыстыку іншых герояў;
   г) праз учынкі;
   д) у размоўнай характарыстыцы;
   е) праз адносіны да прыроды?

Вызначыць ролю пейзажных замалёвак у раскрыцці характараў герояў, абудзіць у вучняў захапленне прыгажосцю роднай зямлі дапамогуць разважанні над наступнымі пытаннямі:

♦ Якую ролю адыгрываюць апісанні прыроды ў аповесці?

Вучні адкажуць, што прырода не толькі дапамагае Мірону і Віктару не толькі выжыць, але выступае і як духоўнае багацце, якое прыносіць эстэтычную асалоду.

Усё жывое ў прыродзе выклікае ў нашых герояў цікавасць і клопат. Жыццёвыя абставіны вымушаюць іх жыць паляваннем, але палююць яны са шкадаваннем, з жалем, што трэба ахвяраваць жывой істотай, без жорсткасці і паляўнічага азарту. «Але ж шкада забіваць гэта мілае стварэнне!» — уздыхае Віктар, збіраючыся напасці на вожыка. «Эх!» — вырвалася ў абодвух хлопцаў, нібы яны перанеслі вялікі цяжар», — каменціруе аўтар забойства зайца (раздзелы VIII, X, XIV).

Юнакі глядзяць на прыроду з замілаваннем і захапленнем, хоць для гэтага ў іх, здаецца, няма часу, ды і ўмовы не настройваюць на лірычны лад.

♦ Перакажыце эпізод, у якім гаворыцца, як хлопцы ўпершыню сустрэліся з бабрамі (раздзел XIV).

Мірон і Віктар так захапіліся назіраннем за бабрамі, што «забыліся і на голад, і на зморанасць, і на таемнага чалавека, і на сваё становішча».

♦ Якія незвычайныя расліны ўбачылі хлопцы на востраве?

♦ З якімі жывёламі сустрэліся Мірон і Віктар на востраве?

Вучні адзначаць, што хлопцы ўбачылі вавёрку, дзіка, ліса, чарапаху, гарнастая, вожыка, баброў, зубра, казулю, барсукоў (раздзелы V, VI, IX, X, XII—XIV). Яны сустрэлі на востраве дзіўных зялёных жаб, якія жывуць на дрэвах і, як птушкі, жывяцца казюлькамі, а ікру адкладваюць на зямлі, у вадзе. Хлопцы знайшлі бабровае паселішча, падпільнавалі, як бабры валілі дрэва, разгледзелі іх грэблю. Галлё ўнізе было шчыльна пераплецена, нават замазана зямлёю. Хаткі баброў былі даволі высокія, уздымаліся на рост чалавека, верхнія пласты галля здаваліся паваленымі абы-як, але на глыбіні яны былі пераплецены і замазаны. Уваходаў у хатку было некалькі. Адна хатка была пабудавана на карчы.

♦ Раскажыце пра сустрэчу Мірона і Віктара з зубрам (раздзел XXII).

Самым вялікім перажываннем для хлопцаў было забойства зубра кантрабандыстамі. Яны ўспрынялі гэта з сапраўдным болем і хваляваннем.

Такім чынам, юнакі-рабінзоны любяць Радзіму, да прыроды ставяцца па-гаспадарску, з клапатлівасцю і ашчаднасцю. Нават у самых цяжкіх умовах яны застаюцца гаспадарамі

сваёй краіны. Каб захаваць агонь, ім трэба выкапаць пад дрэвам глыбейшую яму і «пусціць яго пад корань», зразумела, што дрэва будзе сапсавана. Хлопцы робяць гэта са шкадаваннем, усведамляючы свой абавязак пасадзіць замест загубленага дрэва некалькі новых.

У клопаце пра будучыя пакаленні людзей выяўляюцца цэласнасць натуры, вышыня маральнай пазіцыі герояў — якасці, якія вельмі патрэбны сучасным падлеткам.

Мірон і Віктар глядзяць на прыроду і вачыма руплівага гаспадара, які дбае пра яе багацці, і вачыма чалавека, які разумее і любіць яе хараство.

Падагульненнем могуць быць высновы: прырода Беларусі — багатая, разнастайная. Хлопцы добра ведалі прыроду роднага краю і яшчэ больш папоўнілі свае веды і практычныя ўменні за час знаходжання на востраве.

Янка Маўр разам з героямі сваёй аповесці пераконвае нас у тым, што на Беларусі ёсць шмат таямнічых, нязведаных куткоў, не горшых за заморскія.

Падагульненнем абмеркаванага на ўроку могуць быць высновы: бясспрэчна, кожная эпоха нараджае сваіх герояў, якія ўвасабляюць дух часу. Аднак рамантыка герояў Янкі Маўра не супярэчыць светаўспрыманню сучасных падлеткаў, а адвечная праблема — чалавек і прырода — вырастае ў адну з найвастрэйшых праблем сучаснасці.

♦ Настаўнік прапануе вучням выказацца пра творчасць Янкі Маўра і яго аповесць «Палескія рабінзоны». Можна прапанаваць праслухаць верш Еўдакіі Лось «Памяці Янкі Маўра»:

Паміраюць палескія рабінзоны
першапраходцы і адкрывальнікі,
спрадвечныя, нібы ў пушчы бізоны,
скарбаў нашых стваральнікі
і ратавальнікі...
Яны нам вочы на свет адчынялі,
вабілі далеччу, фарбамі, гукамі.
Каб ляталі,
угору нас падкідалі,
каб грэліся, птушанят

на далонях хукалі...
Вучылі: свет не гулі-гулюшкі,
дужыя трэба мору і сушы...
У краіну райскай птушкі
адлятаюць высокія душы...

**Алена Васілевіч «Горкі ліпавы мёд»**

Жыццё кожнага чалавека напаўняецца новымі яркімі фарбамі, калі ён кахае, калі ў сэрцы сваім знаходзіць месца любімаму або любімай. У гэтым пачуцці таксама праяўляецца асоба чалавека, акрэсліваецца яго духоўны патэнцыял.

Эпіграфам да ўрока можна ўзяць словы з верша С. Грахоўскага «Першае каханне»:

…І першага кахання навіна
Была пачаткам радасці і мукі.

***Мэта:*** працягваць знаёміць вучняў з творамі, якія расказваюць пра ўзаемадносіны паміж людзьмі — узнікненне першага кахання. Выхоўваць культуру адносін.

Пасля ўступнай гутаркі правяраецца пачатковае чытацкае ўспрыманне з дапамогай пытанняў:

♦ Ці спадабаўся вам гэты твор?
♦ На якую ён тэму?
♦ З якімі героямі вы пазнаёміліся?
♦ Хто з герояў спадабаўся больш за ўсіх?

У творы раскрываюцца няпростыя ўзаемадносіны, якія склаліся ў чатырнаццацігадовага падлетка з Лідачкаю — студэнткаю педтэхнікума. Складанасць сітуацыі была ў тым, што дзяўчына была старэйшай на чатыры гады і ледзь здагадвалася пра тую буру пачуццяў, якія хвалявалі хлопца, бо таксама перажыла такія ж моцныя пачуцці, толькі ў дачыненні да другога хлопца.

Аповед вядзецца ад імя галоўнага героя Андрэя, які ўспамінае мінулае і тую цудоўную зіму, калі ён хадзіў на каток з Лідачкаю.

Правесці аналіз апавядання можна па наступных пытаннях:

♦ У які час адбываліся падзеі?
♦ Чаму маці вырашыла ўзяць кватарантаў?

Вучні зачытваюць або пераказваюць эпізод, у якім расказваецца пра смерць бацькі галоўнага героя і «праклятае буржуазнае мінулае» яго маці, складанае жыццё ў 30-я гады. Разважаюць над тым, чаму адукаваная жанчына, якая добра валодала замежнай мовай і мела выдатную музыкальную адукацыю і жаданне працаваць, ледзь магла пракарміць сябе і свайго сына. (Вучням патрэбна патлумачыць сказ: «Не, з уменнем і ведамі мае мамы ўзнімаць пралетарскую культуру не было чаго нават і думаць».)

♦ У чым выявілася непадабенства дзяўчат — кватарантак Дашы і Лідачкі?

Вучні павінны супаставіць паводзіны смяшлівай Дашы, якая «ў першы ж дзень, як толькі пасялілася ў нас, камандавала мною ўжо як хацела» і нават хвастала вузенькім паяском, з паводзінамі худзенькай, кволай Лідачкі «з вялікімі, нібыта чымсьці ці то здзіўленымі, ці то спалоханымі вачыма на бледным тварыку».

Калі Даша адразу адчула сябе гаспадыняй, то Лідачка не ведала, з якога боку да чаго прыступіцца, і толькі «моўчкі, дзікавата пазірала на ўвесь гэты вэрхал у чужой кватэры».

Даша была баявой дзяўчынай, хадзіла на танцы, мяняла кавалераў, а Лідачка часцей за ўсё сумавала, плакала ў адзіноце.

♦ Знайдзіце ў тэксце апісанне Лідачкі і патлумачце, чаму ў хлопца ўзнікла жаданне апякаць дзяўчыну.

«Лідачка была на цэлую галаву ніжэй за мяне, хоць між нашым узростам і стаяла чатыры гады розніцы, хоць яна і вучылася ўжо на трэцім курсе педтэхнікума. Рукі ў яе былі такія тоненькія і слабыя, што варта было мне добра страсянуць палавік, і ён тут жа вырываўся з гэтых яе рук-цявінак. Наровячы злавіць палавік, Лідачка бязгучна смяялася і няўлоўна зграбным рухам галавы адкідвала русую касу цераз плячо».

Прапануйце вучням паразважаць над наступнымі пытаннямі:

♦ Як паводзіць сябе Андрэй на катку? Чаму ён ганарыцца сабою?

♦ Чаму смяяліся мама і Даша, нават Лідачка з прапановы «Пажэнім Андрэя з Лідачкаю...», а сам герой толькі злаваўся і чырванеў?

♦ Якія змены адбываюцца ў паводзінах хлопца з прыездам Лідачкі? Якім яму хацелася стаць?

♦ Прачытайце ўрывак з твора. Як у ім характарызуецца Андрэй?

«Мне ў тую зіму нeяк вельмі лёгка і незвычайна радасна жылося на свеце. І мама пакінула скардзіцца на мяне. І ў школе я ні з кім ні разу нават не пабіўся, нікога не пакрыўдзіў, слухаў настаўнікаў і вучыўся добра. З устойлівых серадняков я раптам вырваўся амаль у выдатнікі і надзейна замацаваўся ў іх непахісным авангардзе...»

♦ Што змянілася ў паводзінах Лідачкі з надыходам вясны? Якую драму перажыла дзяўчына?

♦ Чаму Андрэю было «бясконца балюча» за Лідачку?

Пасля такога шчырага сяброўства, якое адбывалася паміж Лідачкай і Андрэем, яна раптам змянілася… Лідачка закахалася ў прыгожага хлопца, які потым адмовіўся ад яе. Дзяўчына моцна перажывала растанне, а Андрэй перажываў за яе, яму было «бясконца балюча».

♦ Які падарунак прыслала Лідачка? Чаму так на яго адрэагавала маці?

Лідачка прыслала пасылку, у якой быў слоік з ліпавым мёдам. А ліста, якога так моцна чакаў Андрэй не было.

♦ Як вы разумееце апошнія радкі апавядання: «Я да вечара плакаў. І з гэтымі слязьмі пакідала мяне назаўсёды маё маленства»?

♦ Чаму апавяданне носіць назву «Горкі ліпавы мёд»?

Вазьміце за аснову свайго выказвання словы С. Грахоўскага: «...І першага кахання навіна // Была пачаткам радасці і мукі».

Першае каханне галоўнага героя было моцным, і ўспамін пра яго захаваўся на ўсё жыццё, абагачаючы яго і асвятляючы. Але першае юнацкае каханне заўсёды напоўнена рамантычнасцю і ўзнёсласцю, таму Андрэй пасля растання так балюча перажываў, плакаў, і «…з гэтымі слязьмі пакідала назаўсёды… маленства».

Прайшло шмат гадоў, герой стаў сталым чалавекам, і яго ўспамін пра юнацкае каханне як «горкі ліпавы мёд».

Потым настаўнік можа прапанаваць вучням паразважаць над выказваннем А. Лойкі: «Каханне і веру не трэба ўсім выстаўляць напаказ — душу чуе толькі неба».

Вучні ўжо ведаюць, што празаічныя творы адлюстроўваюць з цікавымі падрабязнасцямі карціну жыцця. Гэта дасягаецца праз паказ героя ў розных сітуацыях, адносінах з іншымі героямі. Пісьменнікі выкарыстоўваюць розныя прыёмы і спосабы паказу жыцця.

♦ Назавіце гэтыя спосабы-прыёмы.

♦ Што такое аповед? Знайдзіце ў апавяданні прыклады аповеда.

♦ Ахарактарызуйце прыём апісання. Якія бываюць апісанні? Падмацуйце адказ прыкладамі з тэксту.

♦ Вызначце ролю мастацкай дэталі ў творы.

♦ Параўнайце гэты твор з апавяданнем Міколы Лупсякова «Мэры Кэт» па тэме і тых праблемах, якія ў іх уздымаюцца.

## ЛІТАРАТУРА


1. Бальбуров, Э. А. Поэтика лирической прозы. 1960—1970-е годы / Э. А. Бальбуров. — Новосибирск, 1985.
2. Бахтин, М. Эстетика словесного творчества / М. Бахтин. — 2-е изд. — М. : Искусство, 1979.
3. Белецкий, А. И. В мастерской художника слова / А. И. Белецкий. — М. : Высш. шк., 1989.
4. Бельскі, А. І. Жывая мова краявідаў: Пейзаж у беларускай паэзіі / А. І. Бельскі. — Мінск, 1997.
5. Бельскі, А. Свет ад травы да зор: Беларуская паэзія: сістэма вобразаў прыроды, паэтыка пейзажу / А. Бельскі. — Мінск, 1998.
6. Бярозкін, Р. Кніга пра паэзію / Р. Бярозкін. — Мінск : Маст. літ., 1974.
7. Волков, Ф. И. Литература как вид творчества / Ф. И. Волков. — М. : Просвещение, 1985.
8. Дасаева, Т. М. Паэтыка лірызму ў беларускай прозе / Т. М. Дасаева. — Мінск, 1982.
9. Дзюбайла, П. К. У пошуках духоўных каштоўнасцей: Бел. проза сёння / П. К. Дзюбайла. — Мінск, 1987.
10. Дзюбайла, П. К. Праблемы стылю ў сучаснай беларускай прозе / П. К. Дзюбайла. — Мінск, 1973.
11. Дрыжакова, Е. В. В волшебном мире поэзии / Е. В. Дрыжакова. — М. : Наука, 1978.
12. Куляшоў, Ф. Эцюды аб прозе / Ф. Куляшоў. — Мінск, 1964.
13. Лазарук, М. А. Навучанне і выхаванне творчасцю / М. А. Лазарук. — Мінск : Нар. асвета, 1994.

14. Маслова, В. А. Филологический анализ художественного текста : учеб. пособие / В. А. Маслова. — Минск : Універсітэцкае, 2000.

15. Медведев, В. П. Изучение лирики в школе / В. П. Медведев. — М. : Просвещение, 1985.

16. Рагойша, В. П. Паэтычны слоўнік / В. П. Рагойша. — 2-е выд. — Мінск : Выш. шк., 1987.

17. Рагойша, В. П. Гутаркі пра верш: Метрыка. Рытміка. Фоніка / В. П. Рагойша. — Мінск : Нар. асвета, 1979.

18. Ралько, І. Д. Верш і мова / І. Д. Ралько. — Мінск : Навука і тэхніка, 1986.

19. Руцкая, А. Пазакласная праца па беларускай літаратуры : дапам. для настаўнікаў / А. Руцкая. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2000.

20. Смыкоўская, В. Творчая канцэпцыя пісьменніка / В. Смыкоўская. — Мінск, 1976.

21. Яскевіч, А. Грані майстэрства / А. Яскевіч. — Мінск, 1974.

## ЗМЕСТ

**Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў** . . . . . . . . . . . 3
Тлумачальная запіска . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
Таямніца паэзіі і загадка прозы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6

**Дапаможнік для настаўнікаў** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10
Ад аўтараў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10
Прыкладнае планаванне заняткаў факультатыва . . . . . . 11
Метадычныя парады . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14
I. Чарадзейная сіла мастацтва . . . . . . . . . . . . . . . 14
II. Акрыленасць паэзіі і разважлівасць прозы . . 29
III. Нам родная песня ў сэрца запала . . . . . . . . . 32
IV. Загадкавая краіна Паэзія . . . . . . . . . . . . . . . . . 39
V. Таямнічае ў звычайным і паўсядзённым . . . . 47

**Літаратура** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 69

Вучэбнае выданне

Беларуская літаратура
Факультатыўныя заняткі

**ЛОГІНАВА** Таццяна Уладзіміраўна
**МАРОЗ** Таццяна Іванаўна

# ТАЯМНІЦА ПАЭЗІІ І ЗАГАДКА ПРОЗЫ

**7 клас**

***Дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання***

Рэдактар *Н. Ф. Крыцкая*
Камп'ютарная вёрстка *Л. В. Касцюкевіч*
Мастацкі рэдактар *В. П. Калінін*
Стыльрэдактар *Н. Ф. Крыцкая*

Падпісана ў друк 18.10.2010. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Гарнітура Times. Афсетны друк.
Ум. друк. арк. 4,18. Ул.-выд. арк. 3,74. Тыраж 3400 экз. Заказ .

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і Мастацтва».
ЛИ 02330/0494044 ад 03.02.2009.
Вул. Захарава, 19, 220034, г. Мінск.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Друкарня "Перамога"».
ЛП 02330/0494182 ад 03.04.2009.
Вул. Таўлая, 11, 222310, г. Маладзечна, Рэспубліка Беларусь.